

НЯКАЗАЧНЫЯ СТРАСЦІ. ЯК ПІСАЦЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ? 8

АСЦЯРОЖНА: КАСМЕТЫКА! ЯЕ «ЦЁМНЫ БОК» 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 106 (28722)

## ЛІЧБА ДНЯ

**Больш за 110 тысяч**

*гасцей і ўдзельнікаў чакаюць на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое пройдзе 7-8 ліпеня на беразе Дняпра ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна. Падчас свята адбудзецца вялікая колькасць культурных і забаўляльных мерапрыемстваў з удзелам айчынных і замежных музыкантаў, артыстаў і творчых калектываў. У ліку краін-удзельніц Беларусь, Расія, Украіна, Эстонія, Літва, Латвія, Польшча і Германія.*

# Сем дзён, якія год кормяць

## Сучасныя тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы прадставілі на Беларускім аграпрамысловым тыдні, які стартаваў 5 чэрвеня

**Эфектыўныя кантакты, інавацыі і паспяховыя кантракты: Беларускі аграпрамысловы тыдзень — свайго роду справаздача за год для прамыслоўцаў, навукоўцаў і аграрыяў краіны. Пляцоўкай маштабнага міжнароднага мерапрыемства стаў гандлёва-лагістычны комплекс аграгарадка Шчомысліца, што пад Мінскам. Геаграфія ўдзельнікаў выстаў — ад Кітая да Вялікабрытаніі, усяго 28 краін і больш за паўтысячы кампаній, якія працуюць у аграпрамысловым сектары.**

СТАР. 4






Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## КОРАТКА

● Міністэрства транспарту і камунікацый лічыць неабходным адвязаць выплату дарожнага збору ад працэдуры праходжання дзяржтэхагляду. Такое меркаванне выказаў міністр транспарту і камунікацый Анатоль Сівак. Ён адзначыў, што «на працягу трэцяга квартала з'явіцца яснасць, каб з 1 студзеня 2019 года сістэма памянялася».

● **У Століне камунальнікі ўсталявалі копію Эйфелевай вежы. Вышыня канструкцыі складае 11,5 м. Новая славутасць арганічна ўпісалася ў прастору каля фантана галоўнай плошчы горада. Вежа асвятляецца ў цёмны час сутак, каля падножжа размешчана кветкавая клумба.**



● У гандлёвых аб'ектах Мінскай вобласці 9 чэрвеня з 0.00 да 24.00 не будзе ажыццяўляцца продаж піва і слабаалкагольных напояў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш за 7 %.

● **У Маларыце мясцовы жыхар выявіў касцяныя астанкі. Па выніках папярэдняга даследавання, у пахаванні знойдзены парэшткі дзесяці мужчын і адной жанчыны. На гэтай тэрыторыі ў 1940-х гадах праходзілі баявыя дзеянні.**

ISSN 1990 - 763X

18106

■ Тэма

# РЫБАЛКА... ВЫСОКАГА НАПРУЖАННЯ

**Наша краіна літаральна працята лініямі электраперадачы. І калі пад імі проста прайсці па дарозе, то нічога кепскага не здарыцца — паветра, як вядома, ток не праводзіць. Але закрануць незнарок провад можна звычайнай вудачкай падчас рыбалкі ў недазволеным месцы. Разрад — і гэтая неахайнасць становіцца апошняй у жыцці рыбака.**

### Вуглепластык: трывалы і небяспечны

З 2012-га па май 2018 года адбыліся 24 няшчасныя выпадкі ад удару электратокам з рыбакамі. Сярод іх два групавыя. Загінула 19 чалавек, цяжкія траўмы атрымалі сямёра.




За лічбамі — трагедыі сем'яў, якія засталіся без мужоў, сыноў, бацькаў...

— Калі адкруціць час гадоў на дзесяць назад, то такой праблемы паражэння рыбакоў электратокам не было, — кажа **начальнік упраўлення дзяржаўнага энергетычнага нагляду «Белэнерга» Дзмітрый ЛАСЯНКОЎ.** — Яны карысталіся тады пластыкавымі або бамбукавымі вудамі, якія ток не праводзяць. Але з сярэдзіны нулявых у продажы масава пачалі з'яўляцца вуглепластыкавыя вуды, якія атрымалі ў рыбакоў велізарную папулярнасць. Ім жа патрэбна што? Каб вуда была як мага больш доўгай, трывалай і ёмкай. Вуглепластыкавыя вырабы па ўсіх гэтых крытэрыях лепшыя. Але пры ўсіх выгодах яны праводзяць ток.

СТАР. 5

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# Інтарэс з абодвух бакоў

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Валагодскай вобласці Расіі Алегам Куўшыннікавым і абмеркаваў сумесныя праекты. Перспектыўным для абодвух бакоў выглядае вытворчасць трактароў, а таксама пастаўка беларускай тэхнікі.**

«Я інфармаваны пра зацікаўленасць Валагодчыны ў супрацоўніцтве з Беларуссю, — адзначыў падчас размовы кіраўнік дзяржавы. — Мне падаецца, што мы можам штосьці «склеіць» добрае. Асабліва на базе металургічнага завода, дзе мы ўжо сумесна вырабляем пэўную тэхніку». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ведае пра праекты вобласці і імкненне выйсці на больш высокія рубяжы ў забеспячэнні прадуктамі харчавання. «Мы гатовыя разам працаваць», — падкрэсліў Прэзідэнт і звярнуў увагу, што інтарэс павінен быць з абодвух бакоў. «Мы можам стварыць не толькі сумеснае прадпрыемства, але і з нуля распрацаваць вытворчасць, якая патрэбна будзе не толькі на Валагодчыне, але і ва ўсёй Расіі і ў Беларусі», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Алег Куўшыннікаў расказаў пра пакет прапаноў, якія абмяркоўваюцца з найбуйнейшымі вытворцамі трактарнай тэхнікі, МАЗам, Мінскім маторным заводам, «Амкадорам». Ён адзначыў, што далёка прасунуўся праект па стварэнні саюзнага трактара. На сёння ў Валагодскай вобласці выпушчана ўжо больш за 6500 сумесных трактароў на базе Чарапавецкага ліцейна-механічнага завода. Цяпер кожны трэці колавы трактар у Расіі вырабляецца менавіта там. І гэта сумеснае прадпрыемства.

Пасля размовы з Прэзідэнтам губернатар растлумачыў асноўныя моманты, на якія бакі звярнулі ўвагу. Адно з галоўнага, пра што дамовіліся, — гэта лакалізацыя вытворчасці трактарнай тэхнікі менавіта ў Валагодскай вобласці, у Чарапаўцы. Алег Куўшыннікаў растлумачыў, што, калі лакалізаваць вытворчасць і атрымаць прэферэнцыі па лініі ўрада Расійскай Федэрацыі, прадукцыя стане больш канкурэнтаздольнай. Таксама плануецца павялічыць аб'ём вытворчасці ў два разы — да 3500 трактароў у год, аб'яднаць гандлёвыя дамы для рэалізацыі трактарнай тэхнікі не толькі ў Расіі, але і ў краінах СНД, блізкага і далёкага замежжа.

Акрамя таго, Валагодская вобласць зацікаўлена ў адкрыцці сэрвісных і дылерскіх цэнтраў Мінскага аўтамабільнага завода, у пастаўках тэхнікі. У Валагодскую вобласць ужо закуплена 30 аўтобусаў з нізкай падлогай і плануюць закупіць у найбліжэйшы час яшчэ больш за 120 такіх аўтобусаў. Што датычыцца Мінскага маторнага завода, тут ёсць зацікаўленасць у пастаўцы рухавікоў для вытворчасці сумеснай тэхнікі. Гэта пагрузчыкі і экскаватары на базе Чарапавецкага ліцейна-механічнага завода.

Сельскагаспадарчая і лесанарыхтоўчая тэхніка «Амкадора» таксама важная для вобласці. Як расказаў губернатар, уся лесанарыхтоўчая тэхніка ў Расіі імпартная. Алег Куўшыннікаў звярнуў увагу, што ёсць дамоўленасць не толькі аб павелічэнні аб'ёму пастаўкі, але і аб установцы трэнажора ў тэхнікуме ў горадзе Сокал, які якраз рыхтуе спецыялістаў для работы ў лесе. Ужо адкрыты сэрвісны і дылерскі цэнтры «Амкадора».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Напярэдадні

# Чым здзівіць Цындаа?

**На саміце ШАС сустрэнуцца лідары Шанхайскай васьмёркі.**

Ужо праз некалькі дзён — 9—10 чэрвеня — у горадзе Цындаа (усходнекітайская правінцыя Шаньдун) адбудзецца саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Саміт увойдзе ў гісторыю арганізацыі як першая сустрэча лідараў дзяржаў — членаў гэтай арганізацыі ў фармаце вялікай Шанхайскай васьмёркі. Пра гэта ў інтэрв'ю ТАСС заявіў генеральны сакратар ШАС Рашыд Алімаў. «Гэта падзея адкрые новы этап развіцця ШАС. Мяркую, што галоўнай характарыстыкай гэтага этапу стануць большая роля і значэнне ШАС у глабальных справах», — адзначыў Рашыд Алімаў. Паводле яго слоў, у перыяд паміж самітамі ШАС у Астане ў 2017 годзе і самітам у Цындаа пройдзена значная па змесце дыстанцыя. «Як вынік — у парадку дня маючага адбыцца пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў ШАС каля 20 дакументаў, якія закранаюць практычна ўсе аспекты рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня: ад бескампраміснай барацьбы з тэрарызмам і процідзеяння экстрэмізму да пашырэння супрацоўніцтва ў эканоміцы, гандлі, ахове навакольнага асяроддзя», — сказаў Рашыд Алімаў.

Галоўным выніковым палітычным дакументам саміту стане Цындааская дэкларацыя. «У гэтым найважнейшым дакуменце будуць зафіксаваны кансалідаваныя ацэнкі кіраўнікоў дзяржаў ШАС бягучай сітуацыі ў рэгіёне і свеце, сфармуляваны падыходы ШАС да вырашэння актуальных рэгіянальных і глабальных праблем, а таксама пазначаны магістральныя напрамкі работы арганізацыі на найбліжэйшую перспектыву. Яго комплексны характар мае на ўвазе, што ў ім знойдуць адлюстраванне ўсе сюжэты сусветнай палітыкі, якія сёння знаходзяцца ў полі пільнай увагі аб'яднання», — растлумачыў генеральны сакратар ШАС.

**У тэму**

## НА РАДЗІМЕ КАНФУЦЫЯ

Цындаа, як заўважыў намеснік кіраўніка гарадскога ўрада Чжан Ціндун, — мегаполіс з багатай гісторыяй, самабытнай культурай і прывабнай архітэктурай. Ён з'яўляецца адным з пяці асноўных знешнегандлёвых партоў Кітая. У перакладзе з кітайскай Цындаа азначае «сіне-зялёны востраў». У горада-порта на Жоўтым моры досыць вялікі вопыт правядзення міжнародных мерапрыемстваў, прытым што ён з'яўляецца важным звяном транснацыянальнага транспартна-эканамічнага калідора «Адзін пояс — адзін шлях». Бадай галоўнай цікавінкай з'яўляецца тое, што гэтыя мясціны — радзіма сусветнага вядомага філасофа Канфуцыя (яго бацькаўшчына — правінцыя Шаньдун).

Ён звярнуў увагу, што Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва стала запатрабаванай пляцоўкай для спалучэння нацыянальных інтарэсаў дзяржаў-членаў з агульнарэгіянальнымі. «З уступленнем у ШАС найбуйнейшых дзяржаў Азіі — Індыі і Пакістана — арганізацыя ператварылася ў найбуйнейшае ў свеце трансрэгіянальнае аб'яднанне і па агульнай плошчы дзяржаў, што ўваходзяць у яго, і па агульнай колькасці насельніцтва, і па эканамічным патэнцыяле, — падкрэсліў Алімаў. — ШАС сёння набыла глабальны профіль, і яе ўплыў на лёсы свету будзе з часам толькі ўзрастаць, а з улікам тых каштоўнасцяў, якія сумесна прасоўваюць дзяржавы-члены на міжнароднай арэне, арганізацыя будзе садзейнічаць будаўніцтву міжнародных адносін новага тыпу, якія ўвасабляюць узаемную павагу, справядлівасць, роўнасць і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва».

■

■ Знешняя палітыка

# СЦІРАЕМ РУБЯЖЫ

## Канферэнцыю Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ плануюць правесці ў Мінску

**Пра гэта расказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на сустрэчы з міністрам замежных спраў Манголіі, кіраўніком мангола-беларускай парламенцкай групы ў Вялікім дзяржаўным хурале Манголіі Дамдзіны ЦОГТБААТАРАМ. Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу, што Група падтрымкі Шаўковага шляху была створана летась падчас 26-й летняй сесіі ПА АБСЕ ў Мінску. У яе ўваходзяць 22 дзяржавы, у тым ліку Манголія. Па планах канферэнцыя адбудзецца ў першай палове 2019 года.**

Звяртаючыся да двухбаковага супрацоўніцтва, старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў: «Нашы адносіны вельмі блізкімі, цёплымі былі і ў часы Савецкага Саюза. І вельмі добра, што апошнім часам дыялог паміж нашымі дзяржавамі аднавіўся». На думку Уладзіміра Андрэйчанкі, на сёння тавараабарот паміж Беларуссю і Манголіяй вельмі сціплы (крыху больш за $13 млн). Але дынаміка мінулага года і пачатку 2018-га паказвае рост. Акрамя таго, наладжваецца ўзаемадзеянне паміж міністэрствамі і ведамствамі абедзвюх краін, пашыраецца дагаворна-прававая база. Сур'ёзны рэзерв існуе ў міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Беларускія дэпутаты заўсёды адкрытыя да размовы і супрацоўніцтва, звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

Таксама ён нагадаў, што сёлета сесія ПА АБСЕ адбудзецца ў Берліне і рэзалюцыя Беларусі датычыцца пытанняў развіцця лічбавай эканомікі. Яе ўжо падтрымалі 14 дзяржаў, такія як Швейцарыя, Вялікабрытанія, Канада і іншыя. Беларускі бок разлічвае і на падтрымку мангольскіх калег.

Дамдзіны Цогтбаатар падкрэсліў, што абедзве краіны важныя адна для адной як «вокны» ў Еўропу і Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён. Асабліва гэта датычыцца экспарту Манголіі ў еўрапейскія краіны і Беларусі — у Кітай. Палітычны дыялог таксама дае штуршок для падтрымкі эканамічнага складніка. Мангольская эканоміка пачынае набіраць тэмпы: сёлета ВУП падрос у першым квартале на 6,1 %, знізілася беспрацоўе. Краіна знаходзіцца на другім месцы па тэмпе росту ў Паўночна-Усходняй Азіі пасля Кітая. Усе гэта адбіваецца на двухбаковым эканамічным супрацоўніцтве. Пры гэтым Манголія зацікаўлена, каб і бізнесы дзвюх краін лепш пазналі адзін аднаго.

Дамдзіны Цогтбаатар таксама сустрэўся з **кіраўніком урада Беларусі Андрэем КАБЯКОВЫМ.** Прэм'ер-міністр адзначыў: «З улікам увагі, якая ўдзяляецца ўрадамі нашых краін развіццю сельскай гаспадаркі, вялікія перспектывы мае ўзаемадзеянне ў галіне раслінаводства, жывёлагадоўлі, ветэрынарыі. У цяперашні час намі вывучаецца магчымасць рэалізацыі комплекснага праекта па стварэнні беларускім бокам першага ў Манголіі малочнага кластара». Пры гэтым наша краіна можа падзяліцца сучаснымі тэхналогіямі па перапрацоўцы, захоўванні і вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Акрамя супрацоўніцтва ў гэтай галіне, Беларусь зацікаўлена ў нарошчванні паставак пасажырскіх аўтобусаў, камунальнай тэхнікі, абсталявання і тэхналогій. Андрэй Кабякоў прапанаваў асаблівую ўвагу ўдзяліць праектам вытворчай кааперацыі, у тым ліку сумесным прадпрыемствам па выпуску прадукцыі машынабудавання.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У БЕЛЫМ ДОМЕ НАЗВАЛІ ЧАС СУСТРЭЧЫ ТРАМПА І КІМ ЧЭН ЫНА

Прадстаўнік Белага дома Сара Сандэрс заявіла, што сустрэча прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і лідара Паўночнай Карэі Кім Чэн Ына прызначана на 12 чэрвеня ў Сінгапуры ў 9 раніцы па мясцовым часе (4.00 па мінскім). Пра гэта паведамляе Bloomberg. Яна таксама дадала, што цяпер дэлегацыя ЗША ў Сінгапуры ўзгадняе канчатковыя дэталі па лагістыцы і «застанецца там да пачатку сустрэчы».

### У ЕЎРОПУ ЗА ПЕРШЫЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ ПРЫБЫЛІ 20 ТЫСЯЧ МІГРАНТАЎ

Аб гэтым заявіў першы намеснік старшыні камітэта па эканоміцы і фінансах Еўрапарламента Маркус Фербер падчас міжнароднай канферэнцыі «Выклікі сучасных міграцыйных працэсаў». «Скарачаюцца міграцыйныя патокі. У 2017 годзе было 200 тысяч нелегальных пераходаў мяжы. У асноўным да нас накіроўваюцца людзі з краін Магрыба», — сказаў Фербер. Ён таксама адзначыў, што на маршрутах на шляху ў Еўропу многія мігранты і бежанцы, у першую чаргу жанчыны, сутыкаюцца з гвалтам.

### БІЛ КЛІНТАН ВЫПУСЦІЎ ПРЫГОДНІЦКІ РАМАН ПРА КІБЕРАТАКІ НА ЗША



Біл Клінтан у сааўтарстве са знакамітым пісьменнікам Джэймсам Патэрсанам выпусціў палітычны раман, падзеі якога адбываюцца ў часы яго знаходжання ў Белым доме. Раман мае назву President is Missing («Прэзідэнт прапаў»), і па ім ужо здымаюць серыял. Гэта першы выпадак, калі колішні прэзідэнт ЗША становіцца аўтарам вострасюжэтнага рамана. «Я люблю трылеры, — сказаў экс-прэзідэнт ЗША ў інтэрв'ю Бі-бі-сі. — Я чытаю іх у велізарнай колькасці». Сюжэт разгортваецца вакол кібератакі на ЗША, якая пагражае ўсяму свету. Яе павінен прадухіліць галоўны герой — выдуманы прэзідэнт. Як кажа Клінтан, у кнізе падрабязна апісаны дэталі жыцця ў Белым доме. Ад боўлінга ў склепе да бегавых дарожак у спальні прэзідэнта — «мы сапраўды пастараліся апісаць гэта як мага больш дакладна», кажа Клінтан.

■ Будзь у курсе!

# Карты падкажуць, дзе нельга ў лясы

**Міністэрства лясной гаспадаркі звяртае ўвагу грамадзян на абнаўленне інфармацыі на карце забаронаў і абмежаванняў на наведванне лясоў. Азнаёміцца з гэтай інфармацыяй можна на сайце ведамства.**

Па стане на 9.00 учарашняга дня ў краіне ўведзена забарона на наведванне лясоў у Гомельскай, Брэсцкай (за выключэннем Жабінкаўскага раёна), Гродзенскай (за выключэннем Слонімскага, Навагрудскага раёнаў) абласцях, Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. Увядзенне забаронаў перш за ўсё скіравана на забеспячэнне бяспекі грамадзян, іх маёмасці, а таксама лясного фонду.

У Мінлясгасе нагадалі, што, згодна з артыкулам 15.29 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, за парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах або на тарфяніках або забароны на іх наведванне, якое не пацягнула прычыненне шкоды, цягне папярэджанне або штраф да 25 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

## Уступная кампанія

# Падлік балаў на ЦТ стане больш зразумелы

**Метадалогія падліку балаў на ЦТ павінна змяніцца, але сёлетніх абітурыентаў змяненні не закрануць. Пра гэта ў інтэрв'ю праграме «Тыдзень» на тэлеканале СТБ расказаў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

Па яго словах, новая сістэма налічэння балаў будзе больш зразумелай для навучэнцаў і бацькоў і дазволіць супастаўляць адзнакі ў школе з баламі на ЦТ. Новую метадалогію плануецца апрабаваць ужо у бягучую ўступную кампанію, але гэта будзе інфармацыя толькі для спецыялістаў. Для абітурыентаў жа нічога пакуль не зменіцца. Варта растлумачыць, што цяпер у аснову методыкі разліку тэставага бала на ЦТ пакладзена рэйтынгавая шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і ўлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання, а яна залежыць ад таго, колькі абітурыентаў з ім справіліся.

У інтэрв'ю на СТБ Ігар Карпенка згадаў таксама некаторыя змяненні ў прыёмнай кампаніі, якія маюць адбыцца: «За цэнтралізаваным тэсціраваннем нельга страціць асобу абітурыента, таму, хутчэй за ўсё, пры паступленні на некаторыя спецыяльнасці могуць з'явіцца ўнутраныя іспыты».

Таксама могуць змяніцца форма выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы і фармат уступных іспытаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, паколькі цяпер яны не адпавядаюць адно аднаму. «Напэўна, мы павінны выйсці на нейкую форму, якая дазволіла б збалансаваць патрэбы і школы, і навучэнцаў, і бацькоў», — падкрэсліў міністр.

Што датычыцца прафілізацыі навучання ў школе, то яна, на думку міністра, найбольш эфектыўная з 7-8 класа, калі ўжо можна комплексна ацаніць магчымасці дзіцяці, у якой сферы ён сябе праявіў (гуманітарнай, фізіка-матэматычнай ці хіміка-біялагічнай). А пасля 9 класа, калі школьнік вытрымае выпрабаванні і пакажа вынікі, ён павінен ужо самастойна выбраць сваю далейшую дарогу.

# Абітурыентаў усё менш

**Руская мова на цэнтралізаваным тэсціраванні будзе самай масавай дысцыплінай — на яе зарэгістравалася амаль 67 тысяч чалавек. А тэст па беларускай мове будуць пісаць каля 25 тысяч абітурыентаў.**

Рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне завяршылася ў краіне 1 чэрвеня. Усяго для здачы тэстаў сёлета зарэгістраваўся 82 471 абітурыент (летась — 92 274). Такім чынам колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет працягвае змяншацца, хоць не выключана, што хтосьці паспрабуе скарыстацца сваімі леташнімі сертыфікатамі ЦТ, тэрмін дзеяння якіх цяпер складае два гады.

Матэматыку плануюць здаваць 45 209 абітурыентаў. На трэцім месцы па папулярнасці ў абітурыентаў англійская мова (27 554 чалавекі). На ЦТ па біялогіі ў пунктах рэгістрацыі было аформлена каля 27 тысяч пропускаў, на фізіку — 25 553, на гісторыю Беларусі — 22 248.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў Беларусі 12 чэрвеня, і па традыцыі першымі ў пункты здачы ЦТ прыйдуць абітурыенты, якія пажадалі здаваць экзамен па роднай мове. Дарэчы, сярод тых, хто рэгістраваўся на ЦТ сёлета, ёсць абітурыенты, якія будуць здаваць дзве мовы (і беларускую, і рускую), каб потым выбраць сертыфікат з найбольш высокімі баламі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

## Я зноў выбіраю...

# «ЗВЯЗДУ» Ў НАШАЙ ХАЦЕ ПОМНЮ З МАЛЕНСТВА

**Гэтыя словы я пачуў ад Наталлі ТРЫГУБОВІЧ у час яе аповеду пра ранейшае жыццё аднавяскоўцаў. Экскурс у сярэдзіну мінулага стагоддзя яна праводзіла ў зале музея Уздзенскай санаторнай школы-інтэрната. Мая суразмоўніца — настаўніца беларускай мовы і літаратуры, педагог, які добра ведае гісторыю свайго краю.**



Наталля ТРЫГУБОВІЧ у школьным музеі.

Гісторыю малой радзімы яна не аддзяляе ад гісторыі ўласнай сям'і, мінулага сваіх бацькоў. Расказваючы аб працаўніках, якія стварылі калектыўную гаспадарку, прыводзіць прыклад сваёй маці — простай работніцы, шчырай жанчыны, умелай гаспадыні. З цеплынёй успамінае: маці з маладосці выпісвала газету «Звязда», цікавілася ўсімі навінамі ў Беларусі і ў свеце. Цяпер матулі ўжо няма, але падпіску працягвае бацька, таксама адданы чытач найстарэйшага беларускага выдання.

— У нашу школу паштальён прыносіць «Звязду» разам з іншымі газетамі. Я з вучнямі заўжды чакаю яе. Для сябе, як для выкладчыка беларускай мовы, для аматара гісторыі, абавязкова знаходжу там шмат новага, карыснага. Наша школа санаторная, таму шукаю ў «Звяздзе» актуальную медыцынскую інфармацыю, дзялюся ёю з вучнямі і калегамі.

Што датычыцца музея, то настаўнікі школы часта карыстаюцца яго экспанатамі для арганізацыі тэматычных гутарак «Рэчы з матчынай хаты». Ручнікі, вышыванае адзенне, сямейныя фотаздымкі, хатнія прылады — для дзятвы нібы масток у мінулае. Звяртаюцца да музейнай калекцыі і рыхтуючы традыцыйныя святкаванні.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара**

## Сітуацыя

# Вада збірае чорную даніну

## Сёлета ўжо патанулі 102 чалавекі




**Май нечакана выдаўся ў Беларусі дадатковым летнім месяцам. Тэмпература паветра амаль не падала ўдзень ніжэй за +20, і таму вада ў рэках і азёрах прагрэлася даволі хутка. І на пляжы масава пацягнуліся адпачывальнікі.**

— Абстаноўка на вадаёмах становіцца трывожнай, — заўважае **старшыня рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах» Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.** — Па стане на 4 чэрвеня ў краіне патанулі ўжо 102 чалавекі, з іх 8 дзяцей. Гэта на 17 чалавек болей, чым летась. Толькі за май загінула на вадзе 45 чалавек.

Пераважная большасць смяротных выпадкаў прыходзіцца на месцы, дзе купанне не дазволена. Гэта кар'еры, меліярацыйныя каналы, так званыя дзікія пляжы. З аднаго боку, адпачывальнікаў спакушае блізкасць такіх вадаёмаў і малая колькасць людзей на іх. Аднак у гэтых месцах не дзяжураць ратавальнікі, і таму на аператыўную дапамогу разлічваць ужо не даводзіцца.

Сёлета дзякуючы своечасовай дапамозе супрацоўнікаў Таварыства ратавання на водах у жывых засталіся 23 чалавекі, сярод якіх трое дзяцей.

— Агулам у краіне працуюць 143 выратавальныя пасты. 504 ратавальнікі будуць несці на іх службу, — працягвае Анвар Ігамбердыеў. Таварыства разам з іншымі арганізацыямі таксама рыхтуе пляжы да адпачынку. Зараз іх налічваецца 478.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

## Прадаецца «Цэнтральны»

Гэты культавы магазін Мінска знаходзіцца на скрыжаванні праспекта Незалежнасці і вуліцы Леніна. У сярэднім у дзень міма яго праходзяць 60—75 тысяч чалавек, праязджае 70—85 тысяч аўтамабіляў. Універсам «Цэнтральны» выстаўлены на продаж за 9 млн 833 тысячы 800 долараў. Агульная плошча «Цэнтральнага» складае 2,8 тысячы «квадратаў», магазіна на другім паверсе — 838 квадратных метраў. Прадавец адзначае выключнае размяшчэнне аб'екта — у цэнтры горада. «Цэнтральны» адкрыўся ў 1977 годзе, папярэдні ўладальнік купіў краму ў 2014 годзе. Ва ўніверсаме цяпер працуе каля 250 чалавек.

**Сяргей КУРКАЧ.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Свитязь» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве – директор ЧУП по оказанию услуг «АспектРеформа» Ангельцовой Н. А. извещает о проведении 21 июня 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Местонахождение лотов: **Гомельская область, г. Рогачев, ул. Белинского, 54а.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получение регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за их счет и их силами | | | | |
| **1** | Станок вертикально-сверлильный СВА-2, инв. № 03001 | **400,00** | 20,00 | 40,00 |
| **2** | Станок сверлильно-пазовальный СВА-2М, инв. № 03002 | **600,00** | 30,00 | 60,00 |
| **3** | Станок сверлильно-пазовальный СВА-2М , инв. № 03003 | **600,00** | 30,00 | 60,00 |
| **4** | Станок для высверливания СВАСА-2, инв. № 03004 | **560,00** | 28,00 | 56,00 |
| **6** | Станок доводочный СД-120, инв. № 03479 | **550,00** | 27,50 | 55,00 |
| **7** | Станок фрезерный ВФК-2, инв. № 02005 | **500,00** | 25,00 | 50,00 |
| **12** | Станок шлифовальный, инв. № 01009 | **82,00** | 4,10 | 8,20 |
| **13** | Фрезерно-копировальный станок, инв. № 01013 | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| **14** | Станок круглопильный ГМ-146, инв. № 01069 | **500,00** | 25,00 | 50,00 |
| **15** | Станок токарный по дереву ТП-40, инв. № 04001 | **460,00** | 23,00 | 46,00 |
| **16** | Станок плоскошлифовальный ШЛПС-7, инв. № 04003 | **600,00** | 30,00 | 60,00 |
| **17** | Станок универсально-фрезерный СФ-676, инв. № 04024 | **1 400,00** | 70,00 | 140,00 |
| **18** | Станок универсально-фрезерный 676 ТОК, инв. № 07021 | **1 400,00** | 70,00 | 140,00 |
| **19** | Станок универсальный 3Е-642, инв. № 06174 | **1 840,00** | 92,00 | 184,00 |
| **24** | Станок заточки круглых пил ТЧПА-6, инв. № 06073 | **720,00** | 36,00 | 72,00 |
| **25** | Станок заточки рамных пил ТЧПА-5 , инв. № 09001 | **800,00** | 40,00 | 80,00 |
| **28** | Станок фуговальный СФ-6-1А, инв. № 09011 | **280,00** | 14,00 | 28,00 |
| **31** | Станок гвоздезабивальный 2ЯГ – 1, инв. № 09015 | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| **35** | Пресс склеивания дверей 939-6, инв.№ 04062 | **1 560,00** | 78,00 | 156,00 |
| **41** | Воздухонагреватель ANTARES, инв. № 03095 | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| **45** | Установка для приемки и выдачи раствора, инв. № 00068 | **480,00** | 24,00 | 48,00 |
| **46** | Тара для раствора ТР-2 (металлическая), инв. № 00017; ящик для раствора ТР-2, инв. № 00054; ящик для раствора ТР-2, инв. № 00055 | **330,00** | 16,50 | 33,00 |
| **47** | Емкость для цемента металлическая, инв. № 01161; емкость для цемента металлическая, инв. № 01162; бетоносмесительная установка МА-500, инв. № 01004 | **8 600,00** | 430,00 | 860,00 |
| **48** | Штукатурная станция СШ-6-СО-50-АМ, инв. № 42038 | **760,00** | 47,50 | 95,00 |
| **49** | Штукатурная станция СШ-6-СО-50-АМ, инв. № 42039 | **760,00** | 47,50 | 95,00 |
| **50** | Растворонасос СО-50А, инв. № 04036 | **490,00** | 24,50 | 49,00 |
| **51** | Растворонасос СО-50А, инв. № 00074 | **490,00** | 24,50 | 49,00 |
| **52** | Емкость 25 куб. металл. д/бензина, 1996 г. в., инв. № 02017 | **1 640,00** | 82,00 | 164,00 |
| **53** | Емкость 25 куб. м, металл./для дизтоплива, инв. № 01016 | **1 640,00** | 82,00 | 164,00 |
| **56** | Тележка траверсная, инв. № 01622 | **410,00** | 20,50 | 41,00 |
| **67** | Автобус «ПАЗ 32053», 2007 г. в., рег. № АВ1886-3, инв. № 051098 | **2 360,00** | 118,00 | 236,00 |
| **70** | Автомобиль «ГАЗ 3110», 2002 г. в., рег. № 4308ЕАВ, инв. № 50030 | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| **71** | Автомобиль «МАЗ 5549», 1990 г. в., г/п 8 тн, рег. № АЕ0268-3, инв. № 01061 | **1 680,00** | 84,00 | 168,00 |
| **72** | Автомобиль «МАЗ 5336602», 2002 г. в., г/п 9,8 тн, рег. № ЕС7451, инв. № 50432 | **4 450,00** | 222,50 | 445,00 |
| **74** | Автомобиль «ВАЗ 21213», 2000 г. в., рег. № 6927ВЕ-3, инв. № 51099 | **1 000,00** | 50,00 | 100,00 |
| **75** | Автомобиль «ЗИЛ-ММЗ», № 4502 АДП-243, рег. № АК1175-3, 1991 г. в., инв. № 00401 | **1 000,00** | 50,00 | 100,00 |
| **76** | Автомобиль «УРАЛ 5557», г/п 5,5 т, седельный тягач, рег. № ЕА4645,1990 г. в., инв. № 01062 | **7 000,00** | 350,00 | 700,00 |
| **77** | Автомобиль «ГАЗ 3307», бортовой, г/п 4,5 тн, рег. № ЕС 6076, инв. № 00421 | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| **78** | Полуприцеп «МАЗ 93801», бортовой г/п 13,5 тн, 1981 г. в., рег. № 0192ЕВ, инв. № 01068 | **750,00** | 37,50 | 75,00 |
| **79** | Полуприцеп «ОДАЗ 9357», бортовой г/п 11 тн, рег. № 6649ЕА, год выпуска – н/о, инв. № 01088 | **500,00** | 25,00 | 50,00 |
| **80** | Прицеп РЛ-551, бортовой, г/п 1 тн, инв. № 5026 | **130,00** | 6,50 | 13,00 |
| **83** | Бульдозер Д-606 до 75 лс, инв. № 02041 | **1 640,00** | 82,00 | 164,00 |
| **84** | Экскаватор ЭО3323А, 1991 г. в., рег. № н/д, инв. № 01102, трактор-погрузчик (экскаватор до 0,4 куб. м) | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |
| **85** | Экскаватор ЭО3322Д, 1984 г. в., рег. № н/д, инв. № 02040 | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |

**Продавец:** ОАО «Свитязь», г. Рогачев, ул. Белинского, 54. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 696-70-06 – управляющий в деле о банкротстве – директора ЧУП по оказанию услуг «АспектРеформа» Ангельцовой Н. А. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Свитязь»):** р/с BY55 BAPB 3012 4615 9001 3000 0000, ОАО «Белагропромбанк», код банка БИК BAPBBY2X, УНН 400241807, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 июня 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 июня 2018 г. в 16.00 включительно.** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **7 (семи) рабочих дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст.127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 02.11.2017 г. и на сайте www.bankrot.gov.by. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# Сем дзён, якія год кормяць



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта даўно стала ўжо фактам, што Беларусь поўнасцю накарміла сваю дзяржаву, сваіх людзей. Больш за тое, прадукты харчавання сталі адным з асноўных пунктаў экспарту. Летась на 6,5 млрд долараў мяса-малочнай і іншай прадукцыі было экспартавана. Але ўнёсак прамыслоўцаў у тым, што мы далі сучаснае абсталяванне, разам з навукоўцамі далі сучасныя тэхналогіі, — сказаў на адкрыцці форуму **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА.**

Форум аб'ядноўвае некалькі выстаў — «Белагра-2018», «Белферма», «Белпрадукт» і «Прам.Холад.Упак». Усё, над чым апошні год працавалі інжынеры-машынабудаўнікі, прадставілі на міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «Белагра-2018». Дасягненні ў сферы жывёлагадоўлі — інкубатары, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання статкам, новыя мадыфікацыі даільных установак, кармы і ветпрэпараты прадстаўлены ў экспазіцыі «Белферма».





Па словах **міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда ЗАЙЦА,** аграпрамысловы комплекс Рэспублікі Беларусь па выніках працы за пяць месяцаў дэманструе станоўчую дынаміку ў сваім развіцці. Пракаментаваў кіраўнік ведамства і абмежаванні Расельгаснагляда на некаторыя віды малочнай прадукцыі ў тары больш за два з паловай літры:

— Для нас гэта, вядома, было нечакана. Але мы да ўсяго гатовыя. Апошнім часам мы назіраем нічым не аргументаваныя і не абгрунтаваныя дзеянні Расельгаснагляда ў дачыненні да беларускіх прадпрыемстваў. Учарашні выпад пра закрыццё нашых прадпрыемстваў — гэта чарговая праява пратэкцыянізму. Ідзе выбіванне з рынку прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на чарговыя рознагалоссі аб патоках малочных рэк з Беларусі, партнёры з Расіі зацікаўлены ў наладжванні моцных эканамічных сувязяў.

— Дзякуючы падтрымцы Міністэрства прамысловасці Беларусі і Міністэрства прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі мы плануем у два разы павялічыць колькасць вытворчасці трактарнай тэхнікі Беларусі на тэрыторыі Валагодскай вобласці. Гэты велізарны рынак Расіі, які цяпер гатоў прыняць тэхніку вашай краіны. Мы сёння ў складзе вялікай расійскай дэлегацыі падпісалі некалькі пагадненняў, якія адчыняюць новае акно магчымасцяў для развіцця інтэграцыйных і кааперацыйных сувязяў дзвюх краін, — паведаміў **губернатар Валагодскай вобласці Алег КУЎШЫННІКАЎ.**



Форум даўно стаў пляцоўкай не толькі навуковага, але і дзелавога супрацоўніцтва. Сёлета яго наведаюць прадстаўнікі больш чым 30 замежных дэлегацый.

Беларускі аграпрамысловы тыдзень — свята для ўсіх, хто звязаны з сельскай гаспадаркай. У праграме мерапрыемства — семінары, конкурсы, дэгустацыі, з'езд грамадскага аб'яднання «Беларускі сялянскі савет» і нават аўкцыён. У якасці лотаў — племянныя жывёлы. Закрыццё форуму і падвядзенне вынікаў адбудзецца 10 чэрвеня.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

■ Літаратура

# КАЛІ ЛАСКА, БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ!..

**Сярод іншых падарункаў, што прывезлі ў Беларусь дзеячы культуры і мастацтва Татарстана ў межах Дзён культуры, — і кніга перакладаў беларускай паэзіі «Хуш Килесез — калі ласка!: беларускія паэты».**




Укладальнікі гэтай анталогіі вершаў 30 мастакоў слова — народны паэт Татарстана Рэнат Харыс і дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак. Пад адной вокладкай — майстры прыгожага пісьменства ад Францыска Скарыны да Юліі Алейчанкі. Рэнат Харыс — перакладчык твораў усіх 30 аўтараў.

Пісьменнік з Казані паспрабаваў стварыць панараму развіцця беларускай паэзіі ў часе. Францішка Багушэвіча дапаўняюць Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Міхась Чарот. У кнізе прадстаўлены вершы Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Рыгора Барадуліна. З сучаснікаў паэтычны дыялог з татарскім чытачом вядуць Мікола Чарняўскі, Віктар Гардзей, Раіса Баравікова, Леанід Галубовіч, Міхась Пазнякоў, Мікола Мятліцкі, Змітрок Марозаў, Віктар Шніп, Алесь Бадак, Людміла Рублеўская. Заўважыў Рэнат Харыс і літаратурную моладзь, пераклаўшы вершы Таццяны Сівец і Юліі Алейчанкі. Канешне ж, шматаблічная беларуская паэзія мае правы на больш шырокае знаёмства. Пра гэта, пра планы на будучыню ў гэтым кантэксце ўдалося запытацца ў народнага паэта Татарстана ўжо ў Мінску. І вось што адказаў Рэнат Харыс:

— Спадзяюся, што гэта толькі пачатак знаёмства татарскага чытача з беларускай паэзіяй у XXI стагоддзі. Я чытаю «Нёман», знаёмлюся праз інтэрнэт з літаратурна-мастацкай перыёдыкай на беларускай мове. Ведаю пра часопісы «Полымя», «Маладосць», газету «Літаратура і мастацтва». І несумненна, буду далей рухацца ў перакладчыцкай справе. Татары з беларусамі сябруюць здаўна, сябруюць стагоддзямі. А значыць — і ўсе падставы для шырокага супрацоўніцтва нашых літаратараў даўно закладзены.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

БелВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| | 31.03.2018 (неаудировано) | 31.12.2017 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 640 785 | 720 387 |
| Драгоценные металлы | 511 | 504 |
| Средства в кредитных организациях | 63 866 | 59 207 |
| Кредиты клиентам | 2 601 180 | 2 586 356 |
| Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи | 516 342 | 537 413 |
| Инвестиции в ассоциированные компании | 4 012 | 3 891 |
| Основные средства | 145 806 | 147 372 |
| Активы, построенные для продажи | 6 392 | 7 848 |
| Инвестиционная недвижимость | 4 185 | 4 295 |
| Нематериальные активы | 38 057 | 36 096 |
| Текущий актив по налогу на прибыль | 39 | 2 757 |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 12 203 | 15 385 |
| Прочие активы | 31 563 | 31 906 |
| **Итого активы** | **4 064 941** | **4 153 417** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитных организаций | 950 666 | 1 050 670 |
| Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь | 50 034 | 5 009 |
| Производные финансовые обязательства | 1 | - |
| Средства клиентов | 2 250 702 | 2 341 774 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 11 762 | 4 507 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 3 946 | 8 215 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 957 | 988 |
| Прочие обязательства | 69 258 | 33 112 |
| Субординированный кредит | 201 352 | 199 340 |
| **Итого обязательства** | **3 538 678** | **3 643 615** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 473 057 | 473 057 |
| Эмиссионный доход | 458 | 458 |
| Дополнительный капитал | 5 485 | 5 485 |
| Фонд переоценки зданий | 22 704 | 22 771 |
| Нереализованная переоценка инвестиционных ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи | 14 653 | 16 606 |
| Накопленная прибыль/(дефицит) | 402 | (17 756) |
| **Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка** | **516 759** | **500 621** |
| Неконтрольные доли участия | 9 504 | 9 181 |
| **Итого капитал** | **526 263** | **509 802** |
| **Итого капитал и обязательства** | **4 064 941** | **4 153 417** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ» за период, закончившийся 31 марта 2018 г.**

(в тысячах белорусских рублей)

| | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2018 (неаудировано) | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2017 (неаудировано) |
|---|---|---|
| **Процентные доходы** | | |
| Кредиты клиентам | 67 808 | 72 763 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 7 812 | 16 842 |
| Средства в кредитных организациях | 390 | 1 023 |
| Финансовая аренда | 12 | 29 |
| | **76 022** | **90 657** |
| **Процентные расходы** | | |
| Средства кредитных организаций | (6 213) | (20 475) |
| Средства клиентов | (16 868) | (23 526) |
| Субординированный кредит | (4 630) | (3 595) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (175) | (99) |
| | **(27 886)** | **(47 695)** |
| **Чистый процентный доход** | **48 136** | **42 962** |
| Резерв под обесценение кредитов | (29 172) | (25 161) |
| Убыток от модификации кредитов | (569) | - |
| Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты | (14) | (164) |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | **18 381** | **17 637** |
| **Чистые комиссионные доходы** | **16 181** | **12 977** |
| Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте: | | |
| – торговые операции | 6 854 | 6 370 |
| – операции с производными финансовыми инструментами | (34) | (200) |
| – переоценка валютных статей | 2 026 | (1 900) |
| Доля в чистой прибыли/(убытке) ассоциированных компаний | 21 | (28) |
| Прочие доходы | 7 278 | 7 987 |
| **Непроцентные доходы** | **32 326** | **25 206** |
| Расходы на персонал | (14 902) | (15 129) |
| Амортизация | (5 710) | (6 084) |
| Налоги кроме налога на прибыль | (829) | (1 003) |
| Прочие операционные расходы | (13 893) | (13 740) |
| Прочие расходы от обесценения и создания резервов | (692) | (158) |
| **Непроцентные расходы** | **(36 026)** | **(36 114)** |
| **Прибыль до налога на прибыль** | **14 681** | **6 729** |
| Налог на прибыль | (494) | 3 673 |
| **Прибыль за отчетный период** | **14 187** | **10 402** |
| Приходящаяся на | | |
| – акционеров Банка | 13 864 | 9 963 |
| – неконтрольные доли участия | 323 | 439 |

Председатель Правления Н.В. Лузгин

Заместитель главного бухгалтера Н.А. Выхота

22 мая 2018 г.

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность, составленная в соответствии с требованиями МСФО, размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельность банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2018 год».

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.

**В соответствии с п. 38 Устава ОАО «Барановичидрев» от 23.03.2011 года уведомляем о проведении внеочередного собрания акционеров Общества, которое состоится 20.06.2018 года в 14.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Поселок восточный, 3**

**Повестка собрания**

1. О итогах работы ликвидационной комиссии Общества за период с 20.12.2017 года по 01.07.2018 г.
2. О продлении сроков ликвидации ОАО «Барановичидрев» до 31.12.2018 года.
3. О упразднении ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» и назначении Ликвидатора А. М. Мищука.
4. О продлении полномочий Ликвидатора ( председателя ликвидационной комиссии) А. М. Мищука до 31.12.2018 г.

Конт. тел. председателя ликвидационной комиссии (Ликвидатора) Мищука А. М.: 8 029 6332490 vel, (029) 8248026 МТС, +375 163 453392.

Председатель ликвидационной комиссии
ОАО «БАРАНОВИЧИДРЕВ» А. М. Мищук
Главный бухгалтер Е. И. Радоман
УНП 200299909

# РЫБАЛКА... ВЫСОКАГА НАПРУЖАННЯ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Электраправоднасць вуглепластыку супараўнальная з паказчыкамі медзі і алюмінію, якія выкарыстоўваюцца для вырабу проваду. Даўжыня такіх вудачак у раскладзеным стане дасягае 9—11 метраў. Драты ж ЛЭП праходзяць, як правіла, на вышыні 6-7 метраў. Таму пры рыбалцы ў ахоўнай зоне ліній электраперадачы дакрануцца да проваду такой вудачкай вельмі проста. Энергетыкі зрабілі шэраг прафілактычных захадаў. Па-першае, акрэслілі ўсе месцы прахаджэння ЛЭП цераз рэкі і вадаёмы і ўзбярэжныя зоны. Там паўсюль устаноўлены папераджальныя плакаты аб забароне рыбалкі.

Але не заўжды рыбакі звяртаюць на іх увагу. Напрыклад, 9 мая на рацэ Заходняя Бярэзіна адбыўся паказальны выпадак. Некалькі людзей лавілі рыбу, адзін з іх зачапіў вудачкай провад пад напружаннем у 35 кілавольт. І самае дзіўнае, што папераджальны плакат знаходзіўся... за два метры!

Энергетыкі пасля пачалі мяняць звычайныя правады на ізаляваныя. Гэта вырашае праблему, але толькі для ліній напружаннем 0,4 кВ і 10 кВ. Калі рыбак дакранецца да ізаляванага проваду такой вудой, то паражэння не будзе.

Першых энергетыкі памянялі ўжо 81 %, другіх — 69 %. І ў хуткім часе гэтыя работы будуць скончаны. Але лініі больш высокага напружання пакуль застануцца такімі, якія ёсць. Так, існуюць тэхналогіі, якія дазваляюць зрабіць ізаляваны провад для напружання ў 35 і 110 кілавольт. Вось толькі кошт пытання такі, што ён атрымаецца ў літаральным сэнсе залаты. Напрыклад, адзін яго кіламетр для лініі ў 110 кілавольт зараз каштуе 57 тысяч долараў. З улікам трохфазнай сеткі памножце гэтую суму на тры. Атрымліваецца ўжо 171 тысяча долараў. Такія лініі перасякаюцца з вадаёмамі ў 400 пунктах. Што ўжо казаць пра лініі яшчэ больш высокага напружання — 330 і 750 кілавольт, якія маюць каля 200 перасячэнняў?

## Рыбак загінуў ад току... у гаражным масіве

Разам жа няшчасных выпадкаў з рыбакамі, якія зачапілі провад пад напружаннем, сёлета адбылося пяць. Чатыры з іх скончыліся смерцю. «Сезон» быў адкрыты 14 красавіка. У Гомельскім раёне на беразе меліярацыйнага канала ў раёне перасячэння з лініяй 110 кВ знайшлі пры абходзе лініі цела пажылога мужчыны, які лавіў рыбу вуглепластыкавай вудачкай. У населенай мясцовасці мінімальная вышыня для проваду складае шэсць метраў ад узроўню зямлі. Там было нават крыху больш за сем, але, як бачым, вудачка аказалася даўжэйшай. 9 мая ўвогуле адбыўся ўнікальны выпадак па-за межамі месца рыбалкі. Побач з гаражным масівам у Мінску праходзіць лінія 110 кілавольт. Мужчына выйшаў з гаража, расклаў сваю сяміметровую вудачку і пачаў ёй размахваць. І ў нейкі момант ён закрануў провад... З велізарнымі апёкамі цела трапіў у бальніцу і праз тыдзень памёр. 20 мая ў Кобрынскім раёне рыбак ішоў з уловам да аўтамабіля. А вудачку не склаў. Недзе спатыкнуўся — і па «законе подласці» зачапіў правад. Разрад забіў небараку. 29 мая ў Чавускім раёне Магілёўскай вобласці рыбак таксама закрануў лінію пад напружаннем у 110 кілавольт. З цяжкімі траўмамі яго шпіталізавалі.

Адметна, што з пяці выпадкаў лінія ў 10 кілавольт была толькі адна, астатнія — з больш высокім напружаннем.

Але каб чалавека ўдарыла токам, зусім не абавязкова дакранацца да проваду. У залежнасці ад умоў надвор'я дастаткова проста наблізіцца праваднікóм да токавядучай часткі, і паветраны прамежак тут жа праб'е.

Два паказальныя выпадкі адбыліся ў 2015 і 2017 гадах. У Кобрыне бацька з сынам пераходзілі канал па мосціку ў ахоўнай зоне ЛЭП. Бацька нёс на плячы раскладзеную сяміметровую вуду і незнарок зачапіў провад пад напружаннем у 110 кілавольт. Малы ішоў наперадзе, але зачапіла і яго. Адметна, што вышыня ЛЭП у тым месцы складала 7,4 метра. А ў 2015 годзе два браты лавілі рыбу з лодкі пасярод возера і адзін з іх таксама зачапіў провад. Ён і загінуў, а яго брат атрымаў цяжкія траўмы.

Ахоўная зона лініі электраперадачы напружаннем у 110 кілавольт складае 20 метраў.

Зрэшты, небяспека можа падсцерагаць і на зямлі. 1 чэрвеня ляснік у Ганцавіцкім раёне ехаў на веласіпедзе і не заўважыў абарваны электрапровад. Яго забіла на месцы. Небараку знайшлі толькі супрацоўнікі электрасетак, якія шукалі месца абрыву проваду пад напружаннем у 10 кілавольт.

— Бяспечная адлегласць у такім выпадку — 8 метраў, — заўважае Дзмітрый Ласянкоў. — Калі вы знайшлі абрыў, то вельмі павольна адыходзьце ад яго, каб не трапіць пад разрад. І паведамляйце адразу ў МНС. Яны перададуць нам неабходную інфармацыю.

## Навошта ўзламалі падстанцыю?

— Пагаварыце з дзецьмі, каб яны не лазілі ў трансфарматарныя падстанцыі, электрашчытавыя ў дамах, — працягвае Дзмітрый Ласянкоў. — Там можа працаваць толькі спецыяльна навучаны персанал. Справа ў тым, што там знаходзяцца токавядучыя часткі без ізаляцыі.

Летась у лютым падлеткі праніклі ў трансфарматарную падстанцыю ў Давыд-Гарадку. Адзін з іх адчыніў дзверы ячэйкі ў 10 кілавольт і наблізіўся да токавядучай часткі. Электрычная дуга тут жа прабіла паветра. Хлопец атрымаў вялікія апёкі тулава, галавы, рук і ног. Мы пасля аглядалі месца здарэння і ўбачылі збітыя навесныя замкі і манціроўку побач.

Сутыкаемся і з выпадкамі паражэння дзяцей токам у дамах. У сумных лідарах — падаўжальнікі. Яны выкарыстоўваюцца як часовае рашэнне праблемы з разеткамі, але... як вядома, няма нічога больш пастаяннага, чым штосьці часовае. Кабель падаўжальніка знаходзіцца, як правіла, на падлозе, па ім ходзяць — і ў адзін момант ізаляцыя можа адваліцца. Ці знойдзе гэтае месца малы — пытанне рытарычнае.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

А вось для звычайных разетак вытворцы знайшлі цікавае тэхнічнае рашэнне. У іх канструкцыі ёсць спецыяльная плашка. Яна рэагуе толькі тады, калі кантакт ідзе з дзвюх адтулін разеткі. Гэта значыць, калі малы паспрабуе ўваткнуць туды пруток, то трагедыі не здарыцца.

## З агню ды пад ток

А вось няшчасных выпадкаў, звязаных з паражэннем токам, у сельскагаспадарчых арганізацыях стала менш. Але ўсе яны выкліканы грубым парушэннем правіл знаходжання ў ахоўнай зоне ліній электраперадачы. Там забараняецца спыняцца, рамантаваць тэхніку, запраўляць яе. Аднак...

2015 год, Гомельская вобласць. На тэрыторыі аўтабазы сельгасарганізацыі кіроўца мыў самазвал. І рабіў гэта чамусьці ў ахоўнай зоне ЛЭП. Ён падняў кузаў, пасля залез туды сам і цалкам заканамерна трапіў пад прабой.

Тады ж адбылося здарэнне і ў Бераставіцкім раёне. У ахоўнай зоне ЛЭП кранаўшчык усталяваў кран. Крануў стралой провад 10 кілавольт, і ў крана загарэліся калёсы. Чалавек выскачыў з крана — і трапіў пад разрад. А ў 2013 годзе камбайнер паставіў тэхніку акурат пад лініяй у 110 кілавольт, каб зрабіць званок па мабільным тэлефоне. Сувязь у гэтым месцы адсутнічала. Ён вырашыў падняцца вышэй. Залез на бункер, стаў у поўны рост. Прабой — і ў выніку смяротная электратраўма.

**Але каб чалавека ўдарыла токам, зусім не абавязкова дакранацца да проваду. У залежнасці ад умоў надвор'я дастаткова проста наблізіцца праваднікам да токавядучай часткі, і паветраны прамежак тут жа праб'е.**

— Нават калі вы парушылі парадак вытворчасці ў ахоўнай зоне ЛЭП, то першае дзеянне, якое вы мусіце рабіць, гэта — не выйсці паглядзець, што там адбываецца, а разарваць кантакт, ад'ехаць ад крыніцы току, — кажа Дзмітрый Ласянкоў. — Бо ў адваротным выпадку вельмі рызыкуеце замкнуць электрычны ланцужок з усімі незваротнымі наступствамі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**об аукционе по продаже бульдозера Komatsu D-355A-3, инв. № 1513, дата выпуска – 1995 год. ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»**

| | |
|---|---|
| Бульдозер Komatsu D-355A-3, инв. № 1513, дата выпуска – 1995 год | Бульдозер Komatsu D-355A-3, бывший в употреблении, заводской № 13663(009602-41635), инв. № 1513, дата выпуска – 1995 год, на гусеничном ходу, с полной массой с отвалом и рыхлителем, 57 600 кг |
| Место нахождения объекта | г. Солигорск, 1РУ, производственная база СУ-149 |
| Начальная цена продажи | 77 040,0 (семьдесят семь тысяч сорок рублей ) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 7 704,0 (семь тысяч семьсот четыре) рубля |
| Продавец | ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции» |
| Организатор торгов | ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции», 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 37 |
| Условие оплаты | 100 % предоплата |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY07PJCB30121000011120000933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 104 г. Солигорск, ул. Богомолова, 16а, ВИК PJCBBY2X, УНП 600122771 |
| Условия аукциона | 1. Победитель аукциона, а в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта.<br>3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу стоимость фактических затрат по организации и проведению аукциона в размере, установленном законодательством, в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона |

Шаг аукциона –10 %.

Аукцион состоится 10 июля 2018 года в 11.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 3-й этаж.

Участниками аукциона могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные юридические лица и индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства.

Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона), к которому прилагаются:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. В случае письменного отзыва данного заявления либо неявки участника торгов на торги сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение пяти рабочих дней со дня их проведения.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем, будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счет в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся).

Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни до 13.00 5 июля 2018 года включительно с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 3-й этаж, юридическая служба.

Регистрация участников аукциона 10 июля 2018 года с 9.00 до 10.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона.

Контактное лицо: Кононович Анатолий Николаевич, тел. 8 (0174) 22 55 34.

Контактное лицо для осмотра Объекта: Гологутский Павел Владимирович, тел. 8 (029) 121 91 27.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Дополнительную информацию можно получить на сайте www.str3.by.

Тел.: +375 (17) 22 55 34; 22 55 36.

## Извещение о проведении 20 июня 2018 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, находящегося в оперативном управлении учреждения «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) |
|---|
| Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 620/D-22089, площадью 110,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622250600001001963, площадью 0,0742 га по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Янки Купалы, 17-2 |
| Начальная цена – 36 000,00 долларов США |
| Сумма задатка – 7 200,00 бел. руб. |
| Дополнительная информация: наличие задолженности за потребленную электроэнергию и газ нанимателей, ранее проживавших в изолированном помещении |

**Продавец имущества:** учреждение «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси», пр-т Победителей, 21, 220126, г. Минск, телефон (017) 203-90-35.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 2 процентам от наивысшей цены предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества, подлежащая оплате в белорусских рублях, определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 20 июня 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.06.2018 по 18.06.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 203-94-15 (учреждение «Дирекция по управлению собственностью Федерации профсоюзов Беларуси»).

## «Уважаемые акционеры ОАО «Центр Моды», 06.07.2018 состоится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 1. Время начала собрания – 11.00. Регистрация участников собрания будет проводиться 6 июля 2018 года с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 1, 2-й этаж, каб. 18

### Повестка дня

1. О досрочном прекращении полномочий членов Наблюдательного совета Общества.
2. Избрание членов Наблюдательного совета Общества.
3. О досрочном прекращении полномочий членов Ревизионной комиссии Общества.
4. Об избрании членов Ревизионной комиссии Общества.
5. Об установлении размера вознаграждения избранным членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

Созыв внеочередного общего собрания акционеров осуществляется Наблюдательным советом ОАО «Центр Моды» по требованию акционеров, обладающих в совокупности не менее чем 10 процентами голосов от общего количества голосов акционеров Общества.

За 10 дней до проведения общего собрания проект решения собрания с приложением необходимых обоснований и пояснений будет выслан представителям государства и каждому акционеру, владеющему более 10 % акций Общества. Указанные материалы будут доступны для ознакомления иным акционерам (их представителям) по месту нахождения Общества в течение 7 дней до проведения собрания (с 25.06.2018 (в рабочие дни с 10.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00)), а также в день проведения Собрания до 14.00.

Для регистрации участник собрания предъявляет:
– акционер (физическое лицо) – документ, удостоверяющий личность;
– представитель акционера (физического лица) – доверенность от имени акционера и документ, удостоверяющий личность представителя;
– представитель акционера (юридического лица) – доверенность от имени юридического лица и документ, удостоверяющий личность;
– руководитель юридического лица, являющегося акционером общества, – документ, подтверждающий его полномочия на участие в собрании, и документ, удостоверяющий личность.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составлен по данным реестра акционеров на 05.06.2018 г.

УНП 100649747

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА БРЕСТСКОГО ОБЛАСТНОГО УПРАВЛЕНИЯ ПО НАДЗОРУ ЗА РАЦИОНАЛЬНЫМ ИСПОЛЬЗОВАНИЕМ ТОПЛИВНО-ЭНЕРГЕТИЧЕСКИХ РЕСУРСОВ

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** Автомобиль «ГАЗ 2217», год выпуска 2001 г., номерной знак 6275 ААЕ | 1 412,58 | 141,26 |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 11 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 10 июля 2018 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, BYN | Сумма задатка, BYN | Общая площадь, кв. м | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение (инв. № 130/С-35420), отделение почтовой связи, помещение на втором этаже. Объект расположен по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Центральная, 13а | 42,69 | 4,27 | 10,60 | 3,0 | Для размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Срок договора аренды** | Не менее 3 лет |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения;<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка;<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал<br>BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 10 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81**

**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) составляет 10 базовых величин.**

**Последний день приема заявлений – 9 июля 2018 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении открытого аукциона 25.06.2018 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, базовые арендные величины* | Размер задатка, базовые арендные величины* | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Изолированное помещение, помещение связи, 1-й этаж, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 3 | 1 | 21,6 | 2,0 | 5,4* | 0,54* | Площади находятся на 1-м этаже пятиэтажного здания, расположенного во второй зоне города на расстоянии 5,4 км от железнодорожного вокзала. В помещениях имеется естественное освещение (за исключением вспомогательных площадей и помещений площадью 28,6 кв. м, 4,7 кв. м, 6,0 кв. м, 6,2 кв. м, 17,8 кв. м, 19,2 кв. м), центральное отопление и электроснабжение; телефонизированы. В здании имеются водоснабжение и канализация. Помещения площадью 28,6 кв. м, 239,4 кв. м, 17,8 кв. м проходные. Площади имеют три отдельных входа с улицы. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 2 | 11,3 | | 2,825* | 0,2825* | |
| | 3 | 45,0 | | 11,25* | 1,125* | |
| | 4 | 52,6 | | 13,15* | 1,315* | |
| | 5 | 32,7 (в т. ч.: 19,2; 1,6; 1,3; 1,5; 1,4; 6,0; 1,7) | | 8,175* | 0,8175* | |
| | 6 | 374,3 (в т. ч.: 28,6; 4,7; 239,4; 6,0; 6,2; 71,6; 17,8) | | 93,575* | 9,3575* | |
| | 7 | 14,4 | | 3,6* | 0,36* | |
| Изолированное помещение, помещение связи, 3-й этаж, Гродненская область, г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 9 | 8 | 44,2 ( в т. ч.: 35,8; 8,4) | 2,0 | 11,05* | 1,105* | Площади находятся на 3-м этаже пятиэтажного здания, расположенного во второй зоне города на расстоянии 5,4 км от железнодорожного вокзала. В помещениях имеется естественное освещение (за исключением помещений площадью 17,8 кв. м, 17,7 кв. м, 11,0 кв. м), центральное отопление и электроснабжение; телефонизированы. В здании имеются водоснабжение и канализация. Помещения площадью 16,7 кв. м и 90,2 кв. м проходные. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 9 | 73,9 (в т. ч.: 35,5; 16,7; 16,5; 5,2) | 2,0 | 18,475* | 1,8475* | |
| | 10 | 107,9 (в т. ч.: 90,2; 17,7) | 2,0 | 26,975* | 2,6975* | |
| | 11 | 17,8 | 2,0 | 4,45* | 0,445* | |
| | 12 | 17,7 | 2,0 | 4,425* | 0,4425 | |
| | 13 | 11,0 | 2,0 | 2,75* | 0,275* | |
| | 14 | 17,1 | 2,0 | 4,275* | 0,4275* | |
| | 15 | 17,8 | 2,0 | 4,45* | 0,445 | |
| | 16 | 121,2 (в т. ч.: 118,3; 2,9) | 2,0 | 30,3* | 3,03* | |
| Изолированное помещение, помещение связи, 4-й этаж, Гродненская область, г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 10 | 17 | 591,6 | 2,0 | 147,9* | 14,79* | Площади находятся на 4-м этаже пятиэтажного здания, расположенного во второй зоне города на расстоянии 5,4 км от железнодорожного вокзала. В помещениях есть естественное освещение (за исключением помещения площадью 8,0 кв. м), центральное отопление и электроснабжение; телефонизированы. В здании имеются водоснабжение и канализация. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 18 | 48,5 | 2,0 | 12,125* | 1,2125* | |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5-й этаж, Гродненская область, г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 11 | 19 | 26,9 | 2,0 | 6,725* | 0,6725 | Площади находятся на 5-м этаже пятиэтажного здания, расположенного во второй зоне города на расстоянии 5,4 км от железнодорожного вокзала. В помещениях есть естественное освещение, центральное отопление и электроснабжение; телефонизированы. В здании имеются водоснабжение и канализация. Помещение площадью 17,9 кв. м проходное. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 20 | 35,1 (в т. ч.: 17,2; 17,9) | 2,0 | 8,775* | 0,8775* | |
| | 21 | 212,0 | 2,0 | 53,0* | 5,3* | |
| | 22 | 34,7 | 2,0 | 8,675* | 0,8675* | |
| Капитальное строение, административное здание, 2-й этаж, помещения, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Телеграфная, 3 | 23 | 31,9 | 2,5 | 7,975* | 0,7975* | Помещения находятся на 2-м этаже двухэтажного кирпичного здания. Здание находится в центральной части города в 1,0 км от железнодорожного вокзала. В помещениях имеются естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. В здании имеется водоснабжение. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 24 | 16,9 | 2,5 | 4,225* | 0,4225* | |
| Капитальное строение, административное здание и склады, 2-й этаж, помещения; Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 25 | 21,7 | 1,0 | 5,425* | 0,5425* | Помещения находятся на 2-м этаже двухэтажного кирпичного здания во второй зоне города. В помещениях имеются естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизированы. В здании имеются канализация, водоснабжение. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |
| | 26 | 11,3 | 1,0 | 2,825* | 0,2825* | |
| | 27 | 11,9 | 1,0 | 2,975* | 0,2975* | |
| | 28 | 21,4 | 1,0 | 5,35* | 0,535* | |
| Капитальное строение, склады, 1-й этаж, часть помещения, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 29 | 173,6 | 1,0 | 43,4* | 4,34* | Площадь находится на 1-м этаже одноэтажного кирпичного здания во второй зоне города. В помещении имеются естественное освещение, электроснабжение. Площади находятся в удовлетворительном состоянии |

*Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB30120000400714000000 в филиале № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гродно, БИК AKBB BY21400 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 с 06.06.2018 по 22.06.2018 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 22.06.2018, не рассматриваются.

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606804, (0152) 432571, факс (0152) 486001.**

■ Год малой радзімы

# ПАД МАТУЛІНАЙ ІГРУШАЙ

**У 1966 годзе наша сям'я з дзесяці чалавек пераехала ў новую драўляную хату і насупраць яе, цераз вуліцу, мама пасадзіла ігрушу. Разам з ёй, дзічкай, раслі і мы, спачатку маміны дзеці, а потым і ўнукі, якія часта прыязджалі ў вёску, асабліва ўлетку.**
**Сёння матулі ўжо няма, пустуе бацькоўская хата, але кожны год, не толькі на Радаўніцу, мы збіраемся за столікам пад ігрушай, каб успомніць бацькоў.**

Кажуць, кожны кулік сваё балота хваліць. Гэта, мабыць, таму, што яно — жывое, і там яму добра. А калі не зусім?

Вёска, дзе прайшло маё дзяцінства і дзе жывуць яшчэ мае родныя, пакрысе вымірае, і дапамагчы ёй я нічым не магу, хоць і вельмі хацеў бы...

Варта заплюшчыць вочы, як перад імі паўстаюць блізкія людзі і рознакаляровы дыван, створаны маці-прыродай: на балаціне паміж вёскамі Карніца і Турыно мноства кветак і траў, над імі — чародкі качак і гаманкіх кулікоў, важныя буслы, салаўіныя спевы...

Раней праз усю вось гэтую прыгажосць пралягала шырокая канава. Выкапаўшы яе (уручную!) у 30-я гады мінулага стагоддзя, вяскоўцы вырашылі праблему моцнай забалочанасці падчас вясновых паводак.

А потым прыйшлі меліяратары. «Узброеныя» тэхнікай, яны ўсё асушылі: зніклі крыніцы, не стала вады ў вясковых калодзежах, збяднеў лес, замест вялікіх ураджаяў на пляцах-тарфяніштах «пасяліліся» пыльныя буры.

І ўсё ж праз паўстагоддзя спустошаная балаціна стала ажываць. Яна зноў зарастае хмызняком і бярозкамі, каля канавы з'явіліся бабры і сталі рабіць гаці. А жыхары вёскі тройчы на тыдзень сустракаюць рэйсавы аўтобус Глуск — Сялец — з надзеяй убачыць на прыпынку некага са сваіх, з тых, хто прыедзе і, можа, застанецца.

**Валерый Васілеўскі,** *г. п. Глуск*

■ Весткі з месцаў

# ДА НАС ПРЫЯЗДЖАЛІ ГОСЦІ

**Смаргонскі дзіцячы сацыяльны прытулак 1 чэрвеня наведалі студэнты факультэта камерцыі і турыстычнай індустрыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Іх не збянтэжыла ні адлегласць (больш за сто кіламетраў ад Мінска), ні ўласная занятасць на заліках і іспытах. Па ўсім было відаць, што да візіту госці рыхтаваліся.**

З першых хвілін пасля прыезду студэнты з выхаванцамі знайшлі агульную мову: распытвалі дзетак аб іх інтарэсах і захапленнях, расказвалі пра сябе і вучобу. Затым пачаліся сумесныя цікавыя гульні, а нарэшце «салодкі стол» з сокам, зефірам, садавінай, цукеркамі, нават кексамі, якія студэнты выпякалі самі.

У сваю чаргу выхаванцы запрасілі гасцей і сваіх родных на казку «Рэпка на новы лад», у якой сучасны Дзед, прасунутая ў пытанні сацыяльных сетак Бабуля, Унучка-хакер і жывёлы спрабавалі выцягнуць Рэпку. Дзеці таксама чыталі вершы, малявалі на асфальце, удзельнічалі ў танцавальным флэшмобе.

...Трэба сказаць, што гэта ўжо не першая сустрэча нашых выхаванцаў са студэнтамі. І, спадзяёмся, не апошняя.

**Ларыса Татарынава,**
**дырэктар Смаргонскага сацыяльна-педагагічнага цэнтра**



Фота Уладзіміра ВІТКО.

■ Спявай, душа!

# «Да бацькоў зайшоў у хату, Пяць хвілінак за сталом...»

***Шчыра вітаем адраджэнне так неабходнай рубрыкі «Спявай, душа!». Гладкай дарогі!***

Зноў ідзе сезон
гарачы —
Пазмагаемся на дачы!
Можа, нештачка
ўродзіць
І на нашым агародзе.

Штосьці цяпло прыйшло
зарана,
Але ж будуць маразы!
З-за такой вясны
паганай
Будзем сеяць тры разы.

Каб да лецішча
даехаць,
Трэба, людцы,
выбіраць:
Ці ісці-марыцца пехам,
Ці аўтобус штурмаваць.

Да бацькоў зайшоў
у хату,
Пяць хвілінак
за сталом,
Цешча ўжо дае лапату,
Цесць нясецца
з тапаром.

Каб быў трактар
ці канёк,
Я б той плуг і не валок,
Не садзіў бы
пад лапату
І не быў такім гарбатым.

Дзесьці клопат
і нястачы,
Дзесьці гора і бяда.
А ў мяне ёсць хрэн
на дачы
І густая лебяда!

На палях ужо даўно
Не валяецца яно.
Ля кароў — пастух
Пахом
І сем дачнікаў з вядром.

Завіхаецца заўзята,
Хто да лецішча прывык.
Наша тэхніка — лапата,
Наша сэрца — рухавік.

Не чакаем дапамогі
Мы, старэнькія
«грыбы».
Кажуць, воўка кормяць
ногі,
Ну а дачнікаў — гарбы.

**Сужэнцы Астроўскія,** *г. Мінск.*

■ Ёсць пытанне

# Прадаць можна толькі сваё

***Маці маёй жонкі памерла восем гадоў таму. У вёсцы засталася пустая хата. Пакупнікоў на яе не было, а таму афіцыйна спадчына не афармлялася. Да таго ж гэтае афармленне магло каштаваць даражэй, чым сама сядзіба... Пабудавана яна пасля вайны, г. зн. да 1985 года, як патрабуе Указ № 368. Жонка падтрымлівала яе ў належным стане.***
***Цяпер на хату як быццам знайшоўся пакупнік, кажа, што хоча жыць у вёсцы і на рамонт грошы мае...***
***Ведаю, што згодна з указам можна было аформіць дагавор куплі-продажу ў сельвыканкаме незалежна ад таго, аформлена спадчына афіцыйна ці не. Аднак нам адказалі, што па спрошчанай схеме можна дзейнічаць толькі тады, калі ў хаты будзе ўласнік.***
***Як зараз дзейнічаюць нормы ўказа, ці трэба для таго, каб прадаць хату, станавіцца ўласнікам? І яшчэ: ці спатрэбіцца натарыяльна афармленая згода іншых дзяцей (усяго іх у цешчы было пяцёра, і жывуць яны ў іншых населеных пунктах)?***

**Васіль Мікітаў,** *Жыткавіцкі раён.*

Паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 г. № 368 «Аб некаторых пытаннях адчужэння жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах» прадаўцом дома (з афармленнем і рэгістрацыяй дагавора куплі-продажу па спрошчанай схеме ў сельскім выканаўчым камітэце) можа быць асоба, *якая з'яўляецца ўласнікам дома згодна з запісам у пагаспадарчай кнізе.*

У дадзеным выпадку пасля смерці ўладальніка, пазначанага ў пагаспадарчай кнізе, дом стаў спадчынным маёмасцю. Распараджацца гэтай маёмасцю (у прыватнасці, прадаць у вызначаным заканадаўствам парадку) можа спадчыннік, які атрымаў у натарыуса пасведчанне аб праве на спадчыну на жылы дом.

Пры звароце да натарыуса неабходна, у прыватнасці, прадставіць дакумент, які пацвярджае права ўласнасці памерлага грамадзяніна на жылы дом.

У адпаведнасці з заканадаўствам, калі звесткі аб спадчынадаўцы як аб уладальніку дома былі ўнесены ў пагаспадарчую кнігу сельскага выканаўчага камітэта, то, нягледзячы на тое, што жылы дом не зарэгістраваны ў тэрытарыяльнай арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі, дакументам, які пацвярджае права ўласнасці, будзе з'яўляцца адпаведная даведка сельскага выканаўчага камітэта.

Адносна фактычнага прыняцця спадчыны адным са спадчыннікаў. Для атрымання пасведчання аб праве на спадчыну на жылы дом спадчыннік павінен дакументальна пацвердзіць натарыусу факт прыняцця спадчыны, а калі спадчыннік фактычна прыняў спадчыну, але ў яго адсутнічаюць пацвярджальныя дакументы, то факт прыняцця спадчыны ён можа ўстанавіць, звярнуўшыся ў суд.

Іншыя спадчыннікі маюць права адмовіцца ад спадчыны ў парадку, прадугледжаным арт. 1074 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ГК). У прыватнасці, па п. 3 арт. 1074 ГК для адмовы ад спадчыны дастаткова падаць заяву натарыусу па месцы адкрыцця спадчыны.

**Віктар САВІЦКІ**

■ Так ці не. Практыкум

# Ці трэба начаваць у агульніку?

**«Па-руску і кажуць, і пішуць «глава семьи», а як па-беларуску? Не «глава» ж, відаць?» — цікавіцца Алесь з Мінска. «Чым адрозніваюцца словы выбарны і выбарчы?» — задае пытанне Настасся з Гродна. «Грамадскі транспарт ходзіць па пэўных маршрутах і спыняецца на загадзя прадугледжаных прыпынках, — піша Андрэй. — Але казаць «я чакаю прыпынку аўтобуса» будзе, відаць, няправільна?»**

***Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.***

1. Па-беларуску «глава» значыць толькі раздзел у кнізе, артыкуле (хоць і там часта пішуць: раздзел). А вось старэйшага ў сям'і называюць гАлавой. Што датычыцца рускага глава *государства*, то па-беларуску яно звычайна перадаецца праз выраз **кіраўнік дзяржавы.**

2. Слова **выбарны** ўжываецца да пасад, якія можна заняць шляхам выбараў: *старшыня грамадскага аб'яднання — выбарная пасада.* **Выбарчым** называецца ўсё тое, што мае дачыненне да самого працэсу выбараў: *выбарчы бюлетэнь, выбарчы ўчастак* і г. д.

Трэба адзначыць, што для названня таго, што адбываецца перад выбарамі, у нашай мове аднолькава выкарыстоўваюцца два словы — **перадвыбарны** і **перадвыбарчы.**

3. Калі мы гаворым пра транспарт, які спыняецца, слова прыпынак сапраўды часта не падыходзіць. У такой сітуацыі трэба карыстацца словам **спыненне**: *дачакаўся спынення аўтобуса, да цягніка можна падыходзіць толькі пасля поўнага спынення.* Да таго ж у падобных выпадках можна проста па-іншаму сфармуляваць фразу: *дачакацца*, напрыклад, *пакуль аўтобус спыніцца.*

Такія тонкасці могуць мець месца не толькі адносна пары прыпынак/спыненне. Выбар з некалькіх варыянтаў трэба рабіць і ўжываючы словы *выназходка/вынаходства.* Першае — гэта назва рэчы, якую вынайшлі: *апошнія вынаходкі нашых навукоўцаў.* Калі ж нам трэба назваць дзеянне таго, хто нешта вынаходзіць, то ўжываем другое слова: *гэтаму навукоўцу прыпісваюць вынаходства некалькіх рэчаў.*

## У АБАРОНУ СЛОЎ

Дзеяслоў **начаваць**, здавалася б, не мае патрэбы ў абароне: па сваёй будове і паходжанні гэта абсалютна беларускае слова. Яно ёсць у класічнай літаратуры, у фальклоры... Аднак апошнім часам моладзь спрабуе замяняць яго на кароткае *ночыць*. Як *танцаваць* на *танчыць*, *інтэрнат* на *агульнік*, *зубачыстку* на *калупок*... У маладзёжным слэнгу гэта, можа, і дарэчна, а вось у нарматыўным маўленні павінны выкарыстоўвацца агульназразумелыя словы, дапушчальныя ва ўсіх стылях

# «АДКЛАДЗІ ГАДЖЭТ — ВЫХОДЗЬ НА ДВОР!»



Пад такім дэвізам прайшло свята «Дзяцінства — гэта ты і я» каля Мінскага дзяржаўнага Палаца дзяцей і моладзі. Усіх дзяцей і дарослых чакалі гульні і спаборніцтвы, святочны канцэрт, летняя мода і дваровыя батлы, майстар-класы.

Мерапрыемства падтрымалі Мінскае гарадское ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі, упраўленне Дзяржаўтаінспекцыі галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, Мінскі міжнародны жаночы клуб жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў.

**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**







■ Белліт

# СПРЭЧКІ ВАКОЛ КАЗКІ

## Што прапануюць дзецям сучасныя пісьменнікі?

**«Дарагая Адэля, мы з мамай хацелі набыць у кнігарні беларускія кніжкі, але не маглі знайсці палічку з імі, пакуль не ўчапіліся ў прадаўца. У мяне склалася ўражанне, што тут наўмысна хаваюць беларускамоўныя кніжкі: альбо берагуць для сваіх, альбо баяцца хутка іх прадаць і застацца без працы», — такі ліст па электроннай пошце даслаў маленькі чытач свайму любімаму літаратурнаму персанажу. Можна, канешне, пасмяяцца над высновамі хлопчыка, але сем'і, якія адкрылі для сябе сучасную беларускую дзіцячую літаратуру, зразумеюць, чаму малы так падумаў. Беларускія пісьменнікі запрашаюць дзяцей у незвычайны, багаты на ўражанні свет, знаходзяць зразумелых і блізкіх малечы герояў, шукаюць новыя сюжэты і формы падачы. Нашы аўтарскія казкі, перакладзеныя на іншыя мовы, ухваляюць за мяжой. Але ёсць у айчынных дзіцячых кніг адзін недахоп — яны мала разрэкламаваныя. Чаму так адбываецца і што рабіць з гэтай праблемай, спрабавалі разабрацца ўдзельнікі круглага стала, які прайшоў у Нацыянальнай акадэміі навук.**

Сучасны пісьменнік, як заўважылі ўдзельнікі дыскусіі, — і швец і жнец і на дудзе ігрэц. Ён павінен і напісаць кнігу, і парупіцца, каб яе выдалі, і яшчэ выправіцца на пошукі чытача. Уявіце, за год аўтар можа выступаць перад дзіцячымі аўдыторыямі 200—250 разоў і болей! Між іншым, гэта не толькі рэклама кніжнай прадукцыі, але і цэлая кампанія ў падтрымку беларускай мовы. І дзіўна, што, нягледзячы на такія намаганні, дзіцячыя кніжкі застаюцца незапатрабаванымі ў школах, і гэта пры тым, што сёння пісьменнікамі створана багата цікавай літаратуры, якую можна выкарыстоўваць у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Праз займальныя сюжэты аўтары знаёмяць дзяцей з гісторыяй, культурай, фальклорам, расказваюць пра прыродны і жывёльны свет, даюць адказы на пытанні, якія хвалююць сучасных малых, прапрацоўваюць праблемныя сітуацыі, з якімі можа сутыкнуцца маленькі чалавечак.

Чаму ж у спісах літаратуры на лета, якія выдаюць школьнікам, няма беларускіх кніжак? Чаму настаўнікі мала руплцца пра тое, каб дзеці чыталі дадатковую літаратуру, не падказваюць ім, па якія творы можна звярнуцца ў бібліятэкі? Чаму ў дзіцячых садках не чытаюць кніжкі на роднай мове і не выкарыстоўваюць сюжэты і персанажаў для ранішнікаў з беларускіх казак? Але давайце не будзем звязваць усе праблемы выключна з недасканаласцю адукацыйных праграм і недахопам апантаных, энергічных, прасунутых педагогаў.



Фота БелТА.

На жаль, сёння не хапае чытачоў, якія б ведалі родную мову. Але праблема не толькі ў гэтым. Як заўважыла **пісьменніца Алена МАСЛА,** часта нам больш цікава іншаземнае, чым сваё. Між іншым, замежныя выдавецтвы, пасольствы ўкладваюцца, у тым ліку і фінансава, каб раскруціць свае кнігі, персанажаў. А дзе (на якіх рэчах, на якіх сцэнах, на якіх святах) вы можаце ўбачыць айчынных кніжных герояў? Хоць беларускімі пісьменнікамі за апошнія гады створана багата цікавых вобразаў. Напрыклад, тая ж авечка Адэля, прыдуманая Наталляй Бучынскай, ужо стала інтэрактыўным персанажам, з якім дзеткі актыўна камунікуюць праз інтэрнэт.

> Добра было б, каб пра беларускія кніжкі дзеці даведваліся і дзякуючы рэкламе на сшытках, альбомах для малявання — тут можна паказваць як вокладку кніжкі, так і браць з яе малюнкі.

Падчас круглага стала закраналіся і пытанні пра змест беларускай казкі. Напрыклад, спрэчкі разгарэліся вакол таго, як павінен выкарыстоўвацца фальклор пры напісанні сучасных твораў. Ці можа пісьменнік вольна абыходзіцца з народнымі вобразамі, «перакройваць» іх на свой капыл? Альбо ён павінен сур'ёзна ставіцца да фальклору, раіцца з навукоўцамі, ведаць, якімі рысамі народ надзяляў тых ці іншых персанажаў і навошта наогул «запускаў» іх у свет. А пачалося ўсё са згадкі адной сучаснай казкі, у якой дзеці забылі пра маці і тая ператварылася ў Бабу Ягу. «Нельга, каб на адзіным падмурку выраслі аднолькавыя пабудовы. Калі ні на крок не аддаляцца ад гэтага архетыпа, не будзе і развіцця вобраза, змянення ці з'яўлення новага адцення, — заўважае **Наталля БУЧЫНСКАЯ.** — Няхай ствараюцца розныя казкі: і больш класічнага стылю, і тыя, у якіх Бабе Язе надаюцца розныя функцыі».

Не трэба забывацца, што самі дзеці любяць «чараваць» над кніжнымі сюжэтамі, героямі. «Пахадзі, баба, па суседзях, патрасі па амбалах і збяры тону мукі», — напрыклад, так пачаў расказваць казку маленькі сын пісьменніка Валерыя Квілорыя. А далей панеслася: то спякла бабка статоннага калабка, то тысячу калабкоў, якія перамагалі звяроў у лесе. А чаму б не падтрымаць «хуліганскую» дзіцячую фантазію дарослым? І Валерый Квілорыя вырашыў стварыць для малых цікавы праект — аб'яднаў персанажаў з розных казак...

**Валерый ГАПЕЕЎ** заўважыў, што сёння не хапае пісьменнікаў, якія б прытрымліваліся серыяльнасці. Дзіцяці не вельмі цікавыя кніжкі, у якіх творы не звязаныя паміж сабой. Іншая справа, калі вялікая казка складаецца з маленькіх знітаваных гісторый.

Зразумела, у розных аўтараў свае сакрэты, як пісаць творы для юных чытачоў. Але ім трэба ўлічваць выклікі часу: усё ж свет, у якім растуць сучасныя хлопчыкі і дзяўчаткі, імкліва змяняецца. Але пісьменнікі ўпэўненыя, што казка немагчымая без такіх складнікаў, як забава, выхаванне, павучанне. «На нас вялікая адказнасць перад маленькім чытачом. Праз казку ён уваходзіць у свет дабра і зла, пазнае жыццё, з кожнага твора ён павінен вынесці нешта цікавае. Плюс нельга забывацца пра выхаваўчы падтэкст, але барані божа, каб павучальнае ў тэксце было шыта белымі ніткамі, — заўважыў **лаўрэат нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Найлепшыя творы для дзяцей і юнацтва» Сяргей ДАВІДОВІЧ.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

# Небяспека са слоічкаў і флаконаў

## Што ўваходзіць у склад касметычных сродкаў?

**У рэкламных роліках касметыкі, як правіла, няма ні слова пра пабочныя эфекты. Але нават звычайная памада, як сцвярджаюць вучоныя, можа выклікаць карыес, хваробы нервовай сістэмы і нават пухліны.**

Людзям, якія не жадаюць, каб сродкі па доглядзе за сабой прыцягнулі праблемы са здароўем, прыдзецца ўчытвацца ў дробны шрыфт. На першы погляд здаецца, што тут сам Мендзялееў нагу зломіць. Але ж 15 гадоў таму яшчэ ніхто не думаў пра надпісы на прадуктах, а цяпер любы школьнік ведае, для чаго ў каўбасу кладуць глутамат натрыю, а Е330 — гэта ўсяго толькі лімонная кіслата. У выпадку з касметыкай усё яшчэ прасцей: ведаць назубок варта ўсяго толькі пяць слоў з упакоўкі, каб зрабіць правільны выбар і не нашкодзіць здароўю.

«Цёмны бок» кампанентаў касметыкі праяўляецца не адразу. Шляхетныя асобы некалькі стагоддзяў таму выкарыстоўвалі пудру, каб скура арыстакратычных шчок выглядала роўнай і беласнежнай. Але ўся пудра была тады са свінцом, з-за яго з'яўляліся язвы, развіваліся пухліны мозга і параліч.

А бічом сучаснай касметыкі называюць **фталаты**. Іх ужо 50 гадоў дадаюць у пластмасу, каб надаць ёй гнуткасці. Гадоў 30 яны выконваюць гэтую ж ролю ў губной памадзе, а ў лак для пазногцяў іх дадаюць, каб ён менш сколваўся. Толькі сёлета пасля 10 гадоў даследаванняў нарвежскі інстытут аховы здароўя даказаў сувязь развіцця сіндрому дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці ў дзяцей з тым, што іх маці фарбавалі пазногці і вусны да і падчас



цяжарнасці касметыкай з фталатамі. Еўрапейскае аддзяленне «Грынпіса» забіла трывогу пасля даследавання 36 узораў духоў і туалетнай вады самых вядомых брэндаў. Фталатаў, якія выдатна фіксуюць пах у растворы і на скуры, не было ўсяго ў двух флаконах. Ад уздзеяння фталатаў церпіць жаночая рэпрадуктыўная сістэма — малочныя залозы, матка, прыдаткі. Даказана іх таксічнае ўздзеянне на ныркі, печань, лёгкія. На флаконах фталаты часцей за ўсё зашыфраваны (BzBP).

Падчас выбару масак ці крэмаў аддаваць перавагу варта тым, у складзе якіх няма мінеральных **(або касметычных) масел.** Мінеральнае масла гучыць як нешта натуральнае, з прыроды. Так і ёсць, бо яго робяць з цалкам прыроднай нафты. Састаў на такой аснове пакрывае скуру плёнкай, якая не ўвільгатняе, а не дае вільгаці выпарвацца. Пад плёнкай ствараецца парніковы эфект, і поры закаркоўваюцца. Дэрматолагі раяць выбіраць крэмы з арганічнымі масламі. Мінеральныя ніякай карысці нікому, акрамя вытворцаў, не нясуць, бо гэта танна, стабільна і яны не акісляюцца.

Магчыма, хутка ў касметыку забароняць дадаваць **прапіленгліколь**. Гэта ўніверсальны вязкі растваральнік, які ёсць нават у антыфрызе. А нядаўнія даследаванні паказваюць, што прапіленгліколь можа выклікаць сып, сверб, а таксама паверхневыя атручэнні, калі сродак з ім нанесці на скуру, дзе ёсць ранка. На ўпакоўках ён зашыфраваны як PEG або PPG-11, або PPG-15.

Варта пазбягаць **фармальдэгіду**. Яго на ўпакоўках пазначаюць як імідазолідынілмачавіна або гідраксіметылгліцэнат натрыю. Ён небяспечны і забаронены ў касметыцы ў ЗША і Еўропе, а вось у Расіі яго пакуль выкарыстоўваюць.

Пяты небяспечны кампанент — **трыклазан**. Паўстагоддзя таму гэтым пестыцыдам апрацоўвалі палі ад паразітаў. Потым яго сталі дадаваць у мыла, дэзадаранты і зубную пасту. Трыклазан у высокіх канцэнтрацыях парушае функцыю шчытападобнай залозы

---

■ На мяжы

# ЗА КРОК ДА...

**Жыццё — адно. І пра гэта павінны ведаць нашы дзеці**

**Самагубствы ў структуры смяротнасці ад знешніх прычын дзяцей і падлеткаў займаюць трэцяе месца — пасля ДТЗ і ўтапленняў. Згодна са статыстыкай, за апошнія 60 гадоў узровень самагубстваў сярод хлопцаў 15—24 гадоў вырас у чатыры разы, а сярод дзяўчат — удвая. Юнакі ў гэтай узроставай катэгорыі ў 4-5 разоў больш схільныя здзейсніць самагубства, чым дзяўчаты. Пры гэтым апошнія больш схільныя да спробы самагубства. У значнай ступені гэта тлумачыцца тым, што, зводзячы рахункі з жыццём, хлопцы выбіраюць больш рызыкоўныя метады, а дзяўчаты — менш рызыкоўныя (напрыклад, таблеткі). Пра тое, як своечасова заўважыць змены ў паводзінах і адпаведны настрой у дзяцей і падлеткаў, мы пагутарылі з псіхолагам Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталляй СТАТКЕВІЧ.**



***— Наталля Барысаўна, што такое самагубства з пункту погляду псіхалогіі?***

— У гісторыі сусветнай цывілізацыі суіцыд разглядалі як рэлігійную, юрыдычную і маральна-этычную праблему, як пытанне апошняга выбару і свабоды. Самагубства — гэта рэакцыя чалавека на праблему, якая здаецца непераадольнай, напрыклад аддаленне, смерць блізкіх, дзяцінства ў «разбітай» сям'і, сур'ёзная фізічная хвароба, немагчымасць знайсці працу, фінансавыя цяжкасці, наркаманія. Часам і маладыя людзі выбіраюць дабравольны зыход з жыцця як адзін са спосабаў вырашэння праблем.

Згодна з данымі, апублікаванымі Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем суіцыдаў. Асаблівую трывогу ў апошнія 15—20 гадоў выклікае рост іх колькасці сярод падлеткаў і моладзі. Аднак афіцыйная статыстыка суіцыду значна адрозніваецца ад рэальных лічбаў — прыкладна ў чатыры разы, паколькі ў яе трапляюць толькі відавочныя выпадкі. На думку судовых экспертаў, прычынай большасці так званых смерцяў ад няшчаснага выпадку (перадазіроўка лекавых прэпаратаў, падзенне з вышыні, некаторыя аўтамабільныя аварыі) на самай справе з'яўляюцца суіцыды. Таксама ніхто не фіксуе няўдалыя спробы суіцыду, колькасць якіх, па розных ацэнках, у 10—20 разоў большая, чым здзейсненых самагубстваў. У апошнія гады адзначаецца і такі спосаб адыходу з жыцця, як «масавы суіцыд», калі ў спробе ці завершаным самагубстве ўдзельнічаюць дзве і больш асобы.

***— Чаму падлеткі адважваюцца на звядзенне рахункаў з жыццём? Якая асноўная прычына?***

— Калі чалавек вырашае пазбавіць сябе жыцця, гэта азначае, што ў яго свядомасці змянілася фундаментальная этычная катэгорыя — сэнс жыцця. Папросту кажучы, чалавек адважваецца на самагубства, калі пад уплывам тых ці іншых абставін яго існаванне страціла сэнс. Нашымі спецыялістамі было праведзена эксперыментальна-псіхалагічнае даследаванне, мэтай якога было выяўленне ўзаемасувязі структуры асобы і схільнасці да суіцыду ў людзей маладога ўзросту. Мы хацелі даведацца, якая ж структура гэтых хлопцаў і дзяўчат, чаму яны паступаюць так, а не інакш, адракаючыся ад дару жыцця, чаму менавіта суіцыд для іх адзіны выхад з крызіснай сітуацыі. Выбарачную сукупнасць склалі 102 маладыя асобы (85 дзяўчат і 17 юнакоў), якія самастойна звярнуліся па дапамогу са скаргамі дэпрэсіўнага характару. Высветлілася, што недастаткова развітая здольнасць да вырашэння праблем, схільнасць да перажывання безнадзейнасці і зніжаная здольнасць да прагназавання пазітыўных падзей іграюць важную ролю ва ўзнікненні і развіцці дэпрэсіўных перажыванняў і сапраўдных суіцыдальных тэндэнцый у асоб юнацкага ўзросту. Атрыманыя тэарэтычныя і эмпірычныя даныя склалі аснову для распрацоўкі навукова абгрунтаваных метадаў псіхалагічнай карэкцыі і прафілактыкі суіцыдальных паводзін.

***— Як распазнаць суіцыдальныя паводзіны, каб своечасова прыняць меры?***

— На жаль, няма спосабу быць на сто працэнтаў упэўненым у суіцыдальных думках іншага чалавека, нават калі гэта ваша ўласнае дзіця. Не існуе дакладнага профілю суіцыдальнага падлетка. Тым не менш існуюць прыкметы, і іх нельга прапускаць. Яны павінны насцярожыць блізкіх, і тым трэба своечасова ўмяшацца, не дапусціць, каб дзіця адчаялася настолькі, каб нашкодзіць сабе. Паводле даных амерыканскай асацыяцыі суіцыдалогіі і іншых арганізацый, у большасці суіцыдальных падлеткаў назіраецца адзін або некалькі наступных фактараў рызыкі. Гэта спробы самагубства ў мінулым, выказванне думак пра самагубства, смерць ці тагасветнае жыццё ў кантэксце смутку, суму, бязвыходнасці, адзіноты ці іншых негатыўных пачуццяў. Рызыка яшчэ вышэйшая, калі ёсць канкрэтны план самагубства. Таксама гэта наяўнасць псіхічных расстройстваў, напрыклад дэпрэсіі, злоўжывання наркотыкамі ці алкаголем, расстройства паводзін, такія рысы, як імпульсіўнасць, раздражнёнасць і агрэсіўныя паводзіны, частыя праявы гневу, павелічэнне ўжывання алкаголю ці наркотыкаў, самагубства іншага чалавека, асабліва члена сям'і ці сябра. Да фактараў рызыкі адносяцца нядаўні цяжкі стрэс (напрыклад, незапланаваная цяжарнасць, страта аднаго з блізкіх, нядаўнія траўмы), сваркі ў сям'і ці сур'ёзны сямейны канфлікт.

**Існуюць прыкметы, і іх нельга прапускаць. Яны павінны насцярожыць блізкіх, і тым трэба своечасова ўмяшацца, не дапусціць, каб дзіця адчаялася настолькі, каб нашкодзіць сабе.**

Варта пералічыць і тое, на што трэба звяртаць увагу, ацэньваючы сваё дзіця на прадмет магчымай суіцыдальнай рызыкі. Дзіця, якое думае пра самагубства, можа адчуваць сумны, трывожны ці «пусты» настрой (напрыклад, заводзіць размовы пра тое, што яно дрэннае, недастойнае), спаць занадта шмат ці наадварот мала, страчваць вагу, апетыт ці мяняць звычкі харчавання, горш сачыць за сабой, гаварыць пра смерць, пастаянна думаць пра яе (напрыклад, пісаць вершы пра смерць), горш паспяваць у школе, праяўляць прыкметы псіхатычнага мыслення, такія як трызненне, галюцынацыі ці дзіўныя думкі, не пераносіць пахвалу ці заахвочванне, страчваць цікавасць да сацыяльных ці спартыўных мерапрыемстваў, адчуваць кардынальныя змены ў асобе — напрыклад, звычайна баязлівае дзіця паводзіць сябе як бунтар, робіцца жорсткім ці агрэсіўным — прад'яўляць фізічныя скаргі, якія не маюць відавочнай фізічнай асновы, такія як галаўныя болі ці болі ў страўніку.

***— Што можна параіць бацькам, якія выхоўваюць падлеткаў?***

— Знаходзьце час, каб паразмаўляць з дзіцем і выслухаць яго. Часам перайсці ад пачуцця бездапаможнасці да надзеі падлетку дапамагае ўсведамленне таго, што яго любяць. Навучыце дзіця станоўчым навыкам барацьбы з цяжкасцямі, і няхай яно ведае, што прасіць дапамогі — гэта нармальна і нават пажадана.

Сачыце за тым, каб у дзіцяці была адпаведная фізічная нагрузка. Рэгулярныя фізічныя практыкаванні — сакрэтная зброя супраць дэпрэсіі, яны дапамагаюць нармалізаваць узровень інсуліну і адначасова павышаюць узровень гармонаў «добрага самаадчування» ў галаўным мозгу. Няхай дзеці рухаюцца, гэта лепш, чым сядзець перад тэлевізарам ці камп'ютарам.

Заахвочвайце дзіця выходзіць на вуліцу і гуляць на сонцы. Дзякуючы бяспечнаму знаходжанню на сонцы выпрацоўваецца вітамін D, які выдатна ўплывае на настрой. Даследаванні паказваюць, што людзі з нізкім узроўнем вітаміну D у 11 разоў больш схільныя да дэпрэсіі, чым тыя, хто атрымліваў яго належную колькасць.

Абмяжуйце колькасць цукру, газіраванай вады, зерневых і апрацаваных прадуктаў у рацыёне дзіцяці. Гэта дапаможа нармалізаваць узровень інсуліну і не стаць ахвярай дзіцячага атлусцення. Цукар выклікае хранічнае запаленне, якое парушае імунную функцыю. Ужыванне цукру непасрэдна звязана з дэпрэсіяй. Дапаўняйце рацыён высакаякаснымі амега-3 тлустымі кіслотамі, яны ёсць, напрыклад, у тлустай рыбе.

Сачыце за тым, каб дзіця дастаткова спала. Устанавіце рэжым сну і адпачынку і прытрымлівайцеся яго. Перапіска з сябрамі ў сацыяльных сетках да раніцы аказвае негатыўны ўплыў на настрой дзіцяці, а таксама на яго агульны стан. Даказана, што належны начны адпачынак абараняе падлеткаў ад дэпрэсіі і суіцыдальных думак.

Заахвочвайце заняткі падлетка ў сферы духоўных і культурных пошукаў. Устаноўлена, што такія заняткі садзейнічаюць больш устойліваму і здароваму развіццю дзяцей. Падлеткі з больш высокім узроўнем духоўнага развіцця менш схільныя да сімптомаў дэпрэсіі і рызыкоўных паводзін

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

■ Чалавек і прырода

# СВОЙ СЯРОД ВАЎКОЎ

## Брытанец стаў важаком воўчай зграі

**На залітую срэбным святлом месяца лясную паляну выбеглі тры дарослыя ваўкі. Неўзабаве да іх далучыўся мужчына. Усе чацвёра ўчынілі вясёлую валтузню, насіліся адзін за адным, то збіваючыся ў кучу, то распадаючыся на пары, а потым пачалі круціцца ў нейкім магічным танцы. Пры гэтым чалавек не выглядаў чужым у звярынай зграі, ён быў яе неад'емнай часткай, мабыць нават важаком. Звяры пакорліва падпарадкоўваліся чалавеку...**



### Язык звяроў

Імя важака ваўчынай зграі — Шон Эліс. Некаторыя суайчыннікі-брытанцы лічаць яго экстравагантным дзіваком, які моцна рызыкуе жыццём. Іншыя мяркуюць, што ён гоніцца за адрэналінам і таннай папулярнасцю, трэція пераканаdebate, што ён — фанатык, адданы навуцы, і глыбокі даследчык, які заслугоўвае ўсялякай павагі. Але сам Шон абыякавы да чужых ацэнак сваёй персоны, ён проста займаецца той справай, якую любіць і якой прысвяціў усё жыццё, піша goodnewsanimal.ru.

Эліс — знакаміты брытанскі заолаг, таленавіты літаратар і журналіст, вядучы і галоўны герой папулярнай тэлевізійнай праграмы «Жыццё з чалавекам-ваўком». Дзеля вывучэння звычак шэрых драпежнікаў Шон адмовіўся ад выгод цывілізацыі і пасяліўся ў ваўчынай зграі, стаўшы на час яе бясспрэчным важаком. Іншыя ваўкі падпарадкоўваліся і цалкам давяраліся яму. Эліс для іх — несумненны аўтарытэт.



Калі двухногі важак і галоўны здабытчык Шон прыцягваў аленевую тушу, галодныя звяры цярпліва чакалі, пакуль насыціцца чалавек, і толькі потым прыступалі да трапезы. Драпежнікі і няўцям, што іх паважаны важак зусім не ганяўся за аленем, не пільнаваў яго ў лесе і не рваў яго горла вострымі ікламі — ён проста ўзяў гатовую тушу на бліжняй біястанцыі, дзе калегі Шона праводзілі цікавыя навуковыя эксперыменты, часткай якіх і было існаванне чалавека побач з ваўкамі. Калегі заолага загадзя па-майстэрску хавалі ў тушы скруткі з вараным мясам, так што Шон не рызыкаваў атрымаць нястраўнасць, харчуючыся толькі сырым мясам.

За доўгія месяцы зносін са звярамі Шону прыйшлося прыняць іх законы, прынцыпы і звычкі, а таксама цалкам адмовіцца ад чалавечай мовы і навуцы... разумець воўчы вой.

— Гэта своеасаблівая і складаная мова звяроў, з дапамогай якой яны выказваюць усю гаму настрояў, жаданняў і пачуццяў! — кажа заолаг і дадае: — Ваўчыцы ўмеюць рабіць адмысловы гук пырхання — гэта сігнал небяспекі, які прымушае шчанюкоў імгненна хавацца. Існуе таксама асаблівае выццё, якое запрашае ваўчанят на трапезу. Наймацнейшая матывацыя на водгук у ваўкоў назіраецца ў лютым — сакавіку, калі надыходзіць шлюбны перыяд.

Шон Эліс дасканала вывучыў воўчую мову і па-майстэрску імітуе ўсе гукі, якія здольны ўтвараць шэрыя драпежнікі. Акрамя таго, ён запісваў гукі, якія выдаюць ваўкі, і мае намер аб'яднаць іх у своеасаблівы слоўнік, які дапаможа навукоўцам-біёлагам у іх працы.

Каб заставацца сваім у зграі, Шон пайшоў на шматлікія цяжкасці, зусім невядомыя сучаснаму чалавеку, які прывык да мяккага камфорту ў побыце: спаў разам з драпежнікамі на голай зямлі, не карыстаўся звычайнымі мыйнымі сродкамі, бо чатырохногія вельмі адчувальныя да старонніх водараў.

— Мне прыйшлося цалкам расстацца са звычкай штодня прымаць душ, я павінен быў захоўваць пах свайго цела, да якога прывыкла зграя, — прызнаваўся заолаг.

Для правядзення сапраўды ўнікальных даследаванняў адважнаму эксперыментатару прыйшлося літаральна стаць ваўком, застаючыся пры гэтым чалавекам. Варта адзначыць, што цікавасць да жыцця дзікіх жывёл прачнулася ў Шоне яшчэ ў раннім дзяцінстве, калі ён жыў на роднай ферме ў Норфалку, і першымі аб'ектамі для назіранняў сталі вожыкі, лісы, совы і барсукі. Шон вучыўся ў іх арыентавацца ўначы па гуках і кажа, што развіў сапраўды звярыны нюх, што дапамагло яму ў далейшым. Сваю прафесійную кар'еру ён пачынаў вучнем егера, затым адслужыў два гады ў марской пяхоце. Вярнуўшыся з войска, Шон цалкам прысвяціў сябе заалогіі.

### Першая кроў

Ён перачытаў сотні кніг пра шэрых драпежнікаў, але значна больш заолагу імпанавала назіраць за ваўкамі з надзейнай хованкі. Вынікі сваіх назіранняў Шон запісваў у адмысловы дзённік. Неўзабаве ён пачаў кантактаваць з такімі ж фанатычнымі натуралістамі па ўсім свеце. Яны падказалі Шону, як і дзе можна атрымліваць гранты для сваіх даследаванняў.

Прафесійныя заолагі ставіліся да яго з пагардай, не ўспрымалі яго ўсур'ёз і называлі «вар'яцкім выскачкам». Але пасля смелыя эксперыменты Шона прымусілі іх прыкусіць языкі. Мэтанакіраваны і ўпарты брытанец навучыўся выбіваць навуковыя гранты пад свае назіранні і цвёрда ішоў да вызначанай мэты — пасяліцца з ваўкамі, стаць для іх сваім, вывучыць іх звычкі і мову.

Яшчэ пры першым знаёмстве з шэрымі драпежнікамі (а гэта здарылася ў 1990 годзе ў ЗША, калі Эліс жыў у індзейскім племені ў штаце Айдаха) ён зразумеў, наколькі разумныя, хітрыя і цямлівыя ваўкі. Менавіта тады Шон упершыню паспрабаваў укараніцца ў ваўчыную зграю, і звяры прынялі яго. Нельга сказаць, што ўкараненне прайшло гладка. Неяк раз звер, які разгуляўся, так схапіў Шона за плячо вострымі зубамі, што вырваў яму частку цягліцы. Навукоўцу прыйшлося тэрмінова пакінуць зграю і звярнуцца да лекара, які зашыў рану. Пасля чаго Эліс зноў вярнуўся да ваўкоў. Нібы засаромеючыся свайго промаху і зразумеўшы віну перад Шонам, воўк-крыўдзіцель цярпліва залізваў яму рану, і літаральна праз некалькі дзён тая зацягнулася. Застаўся толькі шнар, які нагадваў, што з ваўкамі кароткія жарты.

Атрымаўшы першы карысны вопыт зносін з чатырохногімі драпежнікамі, Шон прыступіў да наступнага эксперымента — ён узяў на выхаванне трох ваўчанят-сірот з Расіі (іх бацькоў забілі паляўнічыя) і перадаў малым навуку выжывання ў дзікай прыродзе. Ён стаў для іх сапраўдным настаўнікам і важаком. Але праз паўтара года з роляй лідара навукоўцу прыйшлося расстацца.

Калі ён вярнуўся да іх пасля чарговай камандзіроўкі ў сваю чалавечую сям'ю, ваўкі прынялі яго ў зграю, але далі ясна зразумець, што ў іх ужо ёсць новы важак. Шон не стаў спрачацца і пагадзіўся на падпарадкаванае становішча. Яму было важна застацца ў зграі і працягнуць вывучэнне жыцця драпежнікаў. Яшчэ праз тры гады зграя налічвала тузін асобін. Цяпер звяры жывуць у запаведніку «Комб-Марцін» (Англія).

### Мэта жыцця

Вынікам першых цесных зносін з чатырохногімі драпежнікамі стала кніга, напісаная Шонам, якую ён назваў вельмі сімвалічна: «Свой сярод ваўкоў». Гэта цікавае апавяданне з элементамі строга навуковай справаздачы. Эліс параўноўвае сябе з разведчыкам, які старанна рыхтаваў пранікненне ў ваўчыную зграю і нарэшце трапіў у свет звяроў, каб дасканала вывучыць іх звычкі. Заолагі лічаць, што праца Шона аказала неацэнную паслугу навуцы, бо назіральны аўтар не выпусціў ніводнай дробязі і апісаў тое, з чым сутракаўся кожны дзень.

Спецыялісты адзначалі таксама наяўнасць у кнізе і філасофскага аспекту. Аўтар даказаў, што чалавек — зусім не цар прыроды, якім ён сябе лічыць. Ён — толькі частка яе, асобнае звяно, цесна звязанае з іншымі звёнамі.

— Ваўкі маюць пачуццё ўласнай годнасці і неверагодную прагу жыцця. Гэта дапамагае ім выжываць у самых суровых умовах, — адзначае Шон.

На сустрэчах з журналістамі яму часта даводзіцца адказваць на пытанне: наколькі магчымае ў рэальным жыцці тое, што здарылася са знакамітым Маўглі, якога выхавала ваўчыная зграя? У адказах вучоны заўсёды дакладны і лаканічны:

— З навуковага пункту гледжання, такое цалкам магчыма. У ваўчыцы ў перыяд выкормлівання ваўчанят, асабліва калі зграя ўдалівая ў паляванні, шмат малака. А яе мацярынскі інстынкт настолькі моцны, што, калі свае ваўчаняты знікаюць, яна можа карміць каго пажадаецца. Дарэчы, і легенда пра заснавальнікаў Рыма — Ромула і Рэма, якіх выгадавала ваўчыца, — цалкам магла быць рэальнасцю!

Варта адзначыць, што ў Шона ёсць і звычайная, чалавечая сям'я, а не толькі ваўчыная зграя. Заолаг жанаты і мае двух дзяцей.

— Калі я ненадоўга вяртаюся дахаты, жонка кажа, што я не чалавек, — прызнаецца ён, — воўчыя звычкі выветрываюцца з мяне толькі праз 3-4 тыдні. Але да таго часу мне ўжо пара зноў вяртацца ў зграю.

Сваёй галоўнай мэтай Шон лічыць адраджэнне ў Вялікабрытаніі папуляцыі дзікіх ваўкоў, якія былі вынішчаны ў краіне яшчэ ў XVII стагоддзі.

— Многія лічаць ваўкоў злымі, тупымі і крыважэрнымі забойцамі, — адзначае Шон, — але гэта далёка не так. Пажыўшы з ваўкамі, я зразумеў, што зграя — гэта вялікая і любячая сям'я. Шчаслівы, што навучыўся разумець і любіць гэтых звяроў як сваю сям'ю! ■



■ Тэхналогіі

## Шоўк — медыцынскі матэрыял будучыні?

**Як вы думаеце, што дапаможа чалавецтву ў будучыні перамагчы мноства хвароб? Антыбіётыкі, рэдагаванне геному, медыцынскія мікработы? Даследчыкі з прэстыжнага Універсітэта Пердзю лічаць, што такім матэрыялам будзе шоўк, асаблівую мадыфікацыю якога яны цяпер якраз распрацоўваюць. Паводле заяў навукоўцаў, выкарыстоўваць іх шоўк можна будзе для дэзынфекцыі ран, пры пратэзаванні і нават для замены сухажылляў.**



Для стварэння «лячэбнага» шоўку навукоўцы ўвялі ў ДНК тутавага шаўкапрада спецыяльных бялок, які можа выпрацоўваць пры ўздзеянні святла асаблівыя рэчывы, якія забіваюць хваробатворныя бактэрыі. Самі шаўковыя ніткі маюць чырвоны колер і ўласцівасць люмінесцэнцыі. Як паказала адно з даследаванняў, пасля размяшчэння на шоўку бактэрый E. Coli і асвятлення звычайнымі святлодыёднымі лямпамі за гадзіну колькасць бактэрый зменшылася на 45 %, што па прадукцыйнасці дэзынфекцыі параўнальна з перакісам вадароду. Больш за тое, шоўк валодае таксама астуджальным эфектам, што можна выкарыстоўваць для зняцця запалення. Акрамя гэтага, дзякуючы бактэрыцыднаму эфекту шоўк можна выкарыстоўваць не толькі для стварэння нітак і перавязачнага матэрыялу, але і для паветраных і водных фільтраў.

Але гэтым спектр прымянення шоўку не абмяжоўваецца: як перадае выданне Advanced Science, шоўк можна выкарыстоўваць для ўмацавання касцей пры пераломах. Плюс шоўку перад традыцыйнымі пласцінамі і штыфтамі ў тым, што яго зусім не трэба здымаць, таму што ён цалкам распадаецца за адзін год. А пры дабаўленні нанацэлюлозы яго можна выкарыстоўваць для стварэння штучных сухажылляў. Гібрыдны матэрыял мае трываласць шоўку і неабходную эластычнасць за кошт цэлюлозы для таго, каб выконваць функцыю сухажылля ў чалавечым арганізме ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

■ Гасцёўня

# Джымі НЭЛЬСАН: «Я НІКУДЫ НЕ ЗНІК!»

**...У 90-я літаральна з усіх прасаў гучала песня «Беларускія дзяўчаты» ў выкананні хлопца з экзатычнай знешнасцю і нязвыклым акцэнтам. Потым час змяніўся, прыйшлі іншыя рытмы і іншыя папулярныя артысты. Пра тое, як склаўся далейшы лёс выканаўцы і чым ён жыве сёння, «Звязда» распытала ў самога Джымі Нэльсана.**



## ЯК УЧОРА БЫЛО

***— Помніце, як у вашым жыцці здарыліся «Беларускія дзяўчаты»?***

— У 1995-м разам з аднакурснікам Сяргеем Лаўрэнцьевым мы стварылі свой музычны гурт «Інтэр». Аднойчы гурт запрасілі выступіць на канцэрце ў Вялікім тэатры оперы і балета. Там нас заўважыў Уладзімір Станкевіч, які на той момант працаваў на беларускім тэлебачанні і вёў перадачу «Тэлебом»: пасля канцэрта ён сустрэўся са мной і прапанаваў супрацоўніцтва. Усё закруцілася, як у віры: канцэрты, здымкі, гастролі. На адным з выступленняў у Барысаве на мяне звярнуў увагу Анатоль Ярмоленка і запрасіў да сябе ў маладзёжную студыю «Сябры».

**З дасье**

**Джымі Нэльсан нарадзіўся ў Ліберыі. У 1989 годзе трапіў на вучобу ў Савецкі Саюз, а вярнуцца на радзіму ўжо не змог з-за грамадзянскай вайны. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Жанаты. Выхоўвае дачку.**

Дарэчы, гэта студыя, якая з'явілася ў 1992 годзе, дала творчую стажыроўку і адкрыла для публікі мноства новых імёнаў. Тут «сталі на крыло» Андрэй і Аляксей Хлястовы, Уладзімір Станкевіч і Анжэліка Ют, Дзмітрый Смольскі, Уладзімір Радзівілаў, Тані Фарэда, Гюнеш...

Але праз некаторы час на хвалях зацяжнога эканамічнага крызісу многія беларускія артысты з'язджалі ў суседнюю Расію. Хтосьці прыжыўся, хтосьці вярнуўся... Запрашалі і Нэльсана, але ён нават думкі аб тым, каб паехаць з Мінска, не дапускаў. «Шмат разоў клікалі, практычна ўсе мае сябры цяпер жывуць там. Валодзя Станкевіч часта папракаў: «Што ты будзеш тут рабіць? Давай да нас, зладзім які-небудзь праект, столькі перспектыў!» А я так і не паехаў. Чаму? Бо зусім не ведаю Расію, а ў Беларусі мне ўсё знаёмае і жыць тут падабаецца».

***— З кім-небудзь са студыі цяпер падтрымліваеце стасункі?***

— Практычна з усімі на «Фэйсбуку» перапісваемся, віншуем адзін аднаго з асабістымі святамі. І Анатоль Іванавіч (Ярмоленка. — **Аўт.**) «лайкае» мае запісы, калі нешта яму падабаецца, таксама стэлефаноўваемся з ім часта.

Пасля маладзёжнай студыі прыхільнікаў у Джымі не паменшала, проста змянілася іх кола: адны добра памятаюць усмешлівага дыджэя як вядучага дзіцячых дыскатэк «Лімпапо», другія слухалі яго на радыё альбо адрываліся на танцпляцоўках сталічнага клуба «Рэактар». Усе гэтыя перыяды суразмоўнік згадвае з цеплынёй. А вось са спевамі, гаворыць, канчаткова «завязаў».

***— Многія нават сёння напяваюць радкі з «Беларускіх дзяўчат» і пытаюцца: куды знік Джымі Нэльсан?***

— Нікуды не знік, я тут, глядзіце! Па-ранейшаму раблю сваю музыку, проста не працую ў адным канкрэтным месцы, а выступаю як запрошаны DJ, пішу англамоўныя тэксты песень для сваіх маскоўскіх сяброў.

## ДЖЫМІ І ДЗЯЎЧАТЫ

Колішні музычны хіт для Джымі Нэльсана стаў, можна сказаць, прарочым — цяпер у яго дзве самыя блізкія і «прыгажэйшыя на свеце беларускія дзяўчаты», жонка Святлана і дачка Ціяна.

З будучай жонкай ён пазнаёміўся яшчэ на факультэце журналістыкі БДУ, але, прызнаецца, адразу не адчуў сваю палавінку — спатрэбіліся час і сумесная праца: «Мы разам працавалі на дыскатэцы, прызвычаіліся адно да аднаго, прыгледзеліся...»

А вось Святлана, наадварот, дагэтуль першую сустрэчу памятае ў падрабязнасцях: «Разам з мамай на першым курсе прыехала засяляцца ў студэнцкі інтэрнат, і тут з дзвярэй... выходзіць Майкл Джэксан. А Джымі на той час вельмі любіў Майкла Джэксана і апранаўся падобна: кароткія штаны на шлейках, белыя шкарпэткі, стыльны капялюш. Я кажу: «Ой, мама, глядзі, якая прыгажосць незямная». Мама ў адказ гэтак сувора: «Света, пра вучобу трэба думаць!» А потым высветлілася, што мы з «Джэксанам» жывём на адным паверсе, пазнаёміліся бліжэй, і думаць толькі пра вучобу не атрымалася».

***— За гэты час Джымі пераняў якія-небудзь беларускія рысы — спакой, цярплівасць і г. д.?***

— Не-не, у яго адназначна такая самая гарачая кроў, як і раней. Прычым ва ўсіх сэнсах — ён не толькі лёгка ўспыхвае, але, што мяне дагэтуль здзіўляе, зусім не баіцца холаду. У нас ёсць кажухі, цёплыя курткі, — а Джымі не захутваецца наогул і заўжды раскрывае ўсе вокны ў доме.

— Калі я быў маленькі, то часта хварэў, асабліва пакутаваў на галаўны боль, — дадае Нэльсан. — А калі прыехаў у Беларусь, літаральна праз месяц усё як зняло. Вельмі мне ваш клімат пасуе.

***— Зараз назаву страшную лічбу: вы ўжо амаль 30 гадоў у Беларусі...***

— Так, 28 гадоў жыву ў Мінску. Але адчуванне, што я тут канчаткова «свой», усё ж няма — дагэтуль сумую па радзіме...

А на радзіме за мінулы час прайшлі дзве грамадзянскія вайны і змянілася некалькі прэзідэнтаў (нядаўна першую ў Афрыцы жанчыну-прэзідэнта змяніў на пасадзе легендарны эксфутбаліст Джордж Веа), але паехаць у Ліберыю ў Джымі так і не атрымалася. Дый сваякоў там ужо не засталося. Але сувязь з роднай зямлёй ён усё ж падтрымлівае — ёсць знаёмы, які рэгулярна перадае навіны і фотаздымкі, а таксама прывозіць насенне любімага пякучага перцу, без якога ўся наша ежа падаецца Нэльсану прэснай.

Тым не менш Беларусь — гэта дом яго любімай сям'і. Таму ў свой час на сямейнай нарадзе вырашылі, што дачка мусіць ведаць беларускую мову, і Ціяна паспяхова наведвае беларускамоўную сталічную гімназію, у якой дадаткова вывучаюць англійскую і кітайскую мовы.

## ГРЫБЫ, БАСКЕТБОЛ І ЦУКЕРКІ

***— Працуеце вы ў творчай сферы. А як адпачываеце?***

— Найлепш на прыродзе. У мяне ёсць знаёмыя, разам з якімі вельмі люблю хадзіць у грыбы і наогул блукаць па лесе — атрымліваецца скінуць увесь негатыў і насамрэч расслабіцца. Вось з рыбалкай не пасябраваў: выбраўся аднойчы са Свеціным татам Мікалаем, ён пастаянна нешта выцягваў, а я нічога не злавіў, ды так і закінуў вудачку дзесьці ў кут.

З любоўю да прыроды звязаная і вернасць Джымі дачнаму ўчастку, на якім расце ўсё — ад ліберыйскага вострага перцу да саджанцаў, якія ў каго іншага зачэзлі б, а ў яго ажываюць і пачынаюць пладаносіць.



***— Ходзяць чуткі, што вас зазывалі ў кіно?***

— Некалькі разоў насамрэч здымаўся ў галівудскіх фільмах, якія рабіліся на тутэйшых кінапляцоўках, — але вялікіх роляў не іграў, быў у масоўцы. Таксама ўдзельнічаў у кароткаметражках, якія здымала знаёмая рэжысёр для тэлебачання, але кінакар'еру рабіць ніколі не марыў, гэта дакладна не маё.

**У песні «Беларускія дзяўчаты» асобная цікавая гісторыя. Тэкст яе напісаў яшчэ ў 1955 годзе беларускі паэт Міхась Кавыль (псеўданім Язэпа Лешчанкі). Толькі ў пачатку 90-х кампазітар Дзмітрый Яўтуховіч спецыяльна для «Сяброў» зрабіў з верша песню. Папулярнай жа яна стала якраз у версіі Джымі Нэльсана.**

***— Захапленне музыкай перайшло ў прафесію, атрыманая ў лінгвістычным універсітэце адукацыя таксама спатрэбілася для напісання англамоўных песень. А што з журналістыкай — стала нецікавай?***

— Раней я пісаў тое-сёе пра музыку, вёў праграму на «8 канале». Але цяпер не бачу свайго месца ў гэтай сферы. Дый сучаснай беларускай музыкі, прызнаюся, зусім не ведаю. Толькі за творчасцю «Сяброў» заўжды сачу, а іншых нават не адрозніваю паміж сабой, назаву хіба што "Ляпіса Трубяцкога", «Лепрыконсаў» і Макса Каржа, песні якіх часта замаўляла публіка на дыскатэках. Часам гляджу «Еўрабачанне» разам са Светай, і кожны раз здзіўляюся, навошта беларускія артысты спяваюць на дрэннай англійскай замест таго, каб скарыстоўваць добрую беларускую. Узяць хоць матывы тых жа «Сяброў» альбо «Бясёды», аздобіць сучасным гукам — упэўнены, было б у Беларусі месца ў першых радках рэйтынгаў. Людзі, звяртайцеся часцей да народнай музыкі!

**Фота з асабістага архіва героя публікацыі**

■

# КАЛІ СЭРЦА СПЯВАЕ

## У Мінску прайшоў дабрачынны канцэрт для састарэлых і людзей з асаблівасцямі развіцця

**Учора ў сталічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў адбывалася свята, і гэта адчувалася нават не таму, што ад увахода сустракала музыка і нябачнай ніткай вяла ва ўнутраны дворык, які ператварыўся адначасова ў сцэну і глядзельную залу пад адкрытым небам. Святочны настрой чытаўся перадусім на тварах прысутных — соцень слухачоў канцэрта «Ад сэрца да сэрца», што ўжо шмат гадоў запар ладзяць тут напачатку лета прадзюсарскі цэнтр народных артыстаў Беларусі Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча «Профіартвідэан» сумесна з дабрачынным фондам «Спірас» імя Аляксандра Ціхановіча.**

...Многія гледачы — і тыя, хто з дапамогай валанцёраў прыехаў сюды з іншых гарадоў, і жыхары мінскага дома-інтэрната — відавочна рыхтаваліся да сустрэчы з артыстамі загадзя: прынеслі блакноты для аўтографаў, апранулі найлепшыя ўборы і туфлікі з абцасамі, павязалі святочныя хусткі і гальштукі... Яно і зразумела: для тых, хто амаль увесь час праводзіць у сценах дома-інтэрната, магчымасць трапіць на вялікі жывы канцэрт выпадае гады ў рады, і гэта без перабольшання свята. Таму гледачы сустракалі і праводзілі апладысментамі кожнага выканаўцы, падпявалі і «Купалінку», і сучасныя эстрадныя хіты Тэа, Аляксея Хлястова, Вольгі Жукавай, Дзмітрыя Каралёва ды іншых артыстаў, і класічнае «O, sole mio!», па-дзіцячы шчыра радаваліся і танцавалі пад завадныя рытмы — нават на інвалідных крэслах. А даўнюю сяброўку дома-інтэрната Анастасію Ціхановіч жыхары і персанал тут наогул сустракаюць як родную.

— Галоўная мэта канцэртаў «Ад сэрца да сэрца», традыцыю якіх заклаў некалі яшчэ мой тата, — проста падарыць радасць людзям з няпростымі лёсамі, але адкрытымі сэрцамі, якія вымушаны пастаянна жыць у доме-інтэрнаце, — зазначае Анастасія Ціхановіч. — І гэта вельмі важна для нас, бо дзякуючы такім сустрэчам мы вучымся любові, міласэрнасці, радавацца кожнаму імгненню жыцця. Хачу падзякаваць усім артыстам, якія год ад году ўдзельнічаюць у праекце — кола артыстаў пашыраецца, многія загадзя цікавяцца, ці адбудзецца сёлетні канцэрт. І гэта вельмі прыемна чуць: значыць, наша справа працягнецца, спадзяюся, яшчэ на доўгія гады.

«Я ўжо чатыры гады ўдзельнічаю ў праекце і штораз адчуваю, як раскрываецца сэрца, — прызнаецца заслужаная артыстка Беларусі Алена Ланская. — Людзі з асаблівасцямі развіцця не ўмеюць падладжвацца, хітрыць, яны шчырыя як дзеці, і калі ім падабаецца, яны спяваюць і танцуюць, а калі не — разварочваюцца і сыходзяць. Гэтыя канцэрты паказваюць, чаго ты варты як артыст, і я рада, што нас тут заўжды чакаюць і так цёпла сустракаюць». Дырэктар дома-інтэрната Эльміра Шэрметава дадае, што падобныя музычныя сустрэчы маюць і тэрапеўтычны эфект, бо нясуць толькі светлыя, станоўчыя эмоцыі.

Акрамя летняга канцэрта, нагадала Анастасія Ціхановіч, прадзюсарскі цэнтр «Профіартвідэан» і дабрачынны фонд «Спірас» цягам года ладзяць для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і асаблівасцямі развіцця шматлікія дабрачынныя акцыі, культурныя і спартыўныя мерапрыемствы, а таксама зімовую музычную праграму, дзе па магчымасці збіраюць пастаяльцаў дамоў-інтэрнатаў з розных куткоў Беларусі. Сёлета ж да ліку акцый дабавілася яшчэ адна. У студзені, у дзень памяці Аляксандра Ціхановіча прайшла акцыя «Любоў у падарунак», падчас якой 300 мінчан атрымалі падарункі-сэрцайкі, зробленыя ўласнаручна людзьмі, якія пражываюць у спецыялізаваных дамах-інтэрнатах. А ўзамен зрабілі ім простыя падарункі — кнігі, музычныя дыскі, цукеркі, паштоўкі з цёплымі словамі і частку ўласнай душы.

**Матэрыялы падрыхтавала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Андрэй КЛІМАВЕЦ:

# «У СПАРТСМЕНА ВЕК КАРОТКІ»

## Як беларус стаў чэмпіёнам свету і пабываў на Алімпіядзе з другой зборнай

**Легендарнага гандбаліста Андрэя Клімаўца складана назваць беларусам ці немцам. На самым пачатку 90-х ён зрабіў першыя крокі ў сваёй кар'еры ў мінскім СКА, з якім стаў трохразовым пераможцам чэмпіянату краіны, а ў 1995 годзе перабраўся гуляць у Германію.**

За зборную Беларусі Клімавец правёў 101 афіцыйны матч і на доўгі час упісаў сваё імя ў гісторыю як рэкардсмен па ліку паядынкаў і найлепшы бамбардзір беларускай дружыны. Аднак пасля трыццаці спартсмен аказаўся не запатрабаваны ў камандзе сваёй краіны — калектыў узяў курс на амаладжэнне. Хоць сіл гуляць, а галоўнае, жадання і амбіцый у Клімаўца тады яшчэ хапала, таму на прапанову ад нямецкага боку аб змене грамадзянства ён адказаў станоўча. Неўзабаве ў складзе бундэстым гандбаліст стаў чэмпіёнам свету і ўдзельнікам Алімпійскіх гульняў. Цяпер трэнер нямецкага клуба Андрэй Анатолевіч пастаянна жыве ў Германіі, аднак нязменна летам прыязджае ў родную Беларусь. Гэта і стала падставай для сустрэчы і вялікай размовы пра лёс спартсмена за мяжой.

***— Андрэй Анатолевіч, на радзіме з'яўляецеся кожнае лета?***

— Так, абавязкова. Атрымліваецца толькі раз на год. За летні адпачынак спрабую аб'ездзіць усіх сваякоў і сяброў, убачыць як мага больш знаёмых, з'ездзіць у вёску, схадзіць на рыбалку. Да таго ж у Гомелі праводзіць турнір майго імя, заўсёды імкнуся прысутнічаць там.

***— Ці заўважаеце, як мяняецца краіна?***

— Вядома, становіцца ўсё больш прыгожай, горад расце, становіцца чыстым, зручным. Гэта датычыцца як Мінска, так і Гомеля, заўсёды бываю і там і там. Нават вось гэтую залу *(мы размаўлялі падчас Кубка Беларусі па гандболе ў Палацы спорту «Уручча» —* **Аўт.**) не параўнаць з той, якая была ў часы, калі я тут трэніраваўся. Тады гэта быў лёгкаатлетычны манеж, былі дарожкі, лёгкаатлеты бегалі па іх, а пасярэдзіне было поле, дзе трэніраваліся мы на тартане. Зараз залу не параўнаць, усе ўмовы для таго, каб развівацца.

***— Настальгіруеце?***

— Вядома, я тут адыграў гадоў 20, гэтая зала для мяне родная.

***— Кожны раз, калі прыязджаеце ў Беларусь, вас можна ўбачыць на гандболе...***

— Для мяне гэта магчымасць сустрэць знаёмых, сёння, напрыклад, убачыўся са сваім першым трэнерам. Пабачыцца з гульцамі, пагутарыць цікава. З Ванем Броўка разам гулялі ў «Мельзунгене», супраць Сяргея Рутэнкі выступаў у Лізе чэмпіёнаў, сёння яны ўсе тут.



* * *

***— Чым цяпер займаецеся ў Германіі вы і сям'я?***

— Я трэнер клуба 3-й лігі «Пфорцхайм». Працую з імі ўжо некалькі гадоў, застаюся і на наступны сезон. Калі быў гульцом, часу вольнага не было — раз'езды, гульні, трэніроўкі, адпачынак там зусім маленькі, плюс гульні за зборную, атрымлівалася так, што я амаль дома не бываў. Цяпер усё па-іншаму, усё змянілася. Больш магу планаваць свой час.

Сын гуляе ў мяне ў камандзе, яму 19 гадоў. Пакуль падабаецца, а як будзе атрымлівацца ў яго далей — паглядзім. Жонка працуе ў басейне інструктарам, а дачка вучыцца на юрыста.

***— Да чаго так і не змаглі прывыкнуць у Германіі?***

— За 22 гады ўжо прывык да ўсяго. Я і там дома, і тут дома.

***— У чым бачыце асноўную розніцу паміж краінамі?***

— Менталітэт у людзей, вядома, іншы. У немцаў распарадак строгі, у нас усё больш свабодна. Я жыву ў невялікай вёсцы, пасля дзевяці гадзін вечара на вуліцы ўжо нікога не ўбачыш. Яны вельмі рана ўстаюць, з'язджаюць на працу ў шэсць гадзін раніцы, таму кладуцца спаць рана. Адпачываюць толькі ў выхадныя, выходзяць у рэстараны. А не так, як у нас: могуць і ў панядзелак. Пунктуальнасць на самым вышэйшым узроўні, ну а ў Беларусі, як вядома, людзі больш жывуць па прынцыпе «пакуль гром не грымне, мужык не перахрысціцца».

***— Для вас які лад жыцця больш камфортны?***

— Думаю, ужо нямецкі. Там у цябе ёсць распарадак, якога прытрымліваешся, і гэта дае пэўныя гарантыі ў жыцці. Што датычыцца спорту, то цяпер усё больш людзей у Беларусі вядуць здаровы лад жыцця. Раней такога не было: колькі людзей на веласіпедах, колькі бегае. У Германіі так ужо даўно. Залы ніколі не пустуюць, у іх у гандбол у 6-й лізе гуляюць 50-гадовыя дзядулі. Калі хочаш, напрыклад, пайсці пагуляць у бадмінтон, трэба заказваць пляцоўку загадзя. Людзі жывуць і атрымліваюць задавальненне.

***— Калі прыгадаць ваш першы прыезд у Германію, чакалі, што затрымаецеся настолькі доўга?***

— Што вы, ніколі! Першы год для мяне быў вельмі цяжкі. Я не ведаў мовы, быў адзін... Праз паўгода ўсё надакучыла, хацеў з'ехаць дадому, але потым неяк прывык, праз год падвучыў мову, усё астатняе само сабой стала на свае месцы. Ну а чым далей, тым было прасцей.

* * *

***— У Германію вы з'язджалі са СКА?***

— Так, паступіла вельмі добрая прапанова, адмаўляцца было б глупствам.

***— Якія самыя яркія моманты з выступленняў за СКА і зборную Беларусі засталіся ў памяці?***

— Напэўна, чэмпіянат Еўропы ў Ісландыі, гэта мой першы турнір, мне было гадоў 18. Я атрымаў шмат эмоцый і ў гульнявым плане, і сама Ісландыя вельмі запомнілася.

***— Вы трапілі ў зборную, калі там гулялі алімпійскія чэмпіёны.***

— Так, Косця Шараварaў, Андрэй Барбышынскі, Саша Мінеўскі, Міша Якімовіч, Саша Тучкін.

***— Як яны вас сустрэлі?***

— Гэта не для прэсы. *(Смяецца.)* Як і ва ўсіх камандах, былі свае звычаі. Старыя — гэта старыя, маладыя — маладыя, не было дзедаўшчыны, але была пэўная іерархія. Мы павінны былі насіць мячы, збіраць іх пасля трэніроўкі, за «мазюку» адказваць, калі мы жывём недзе ў гасцініцы, хадзіць усіх будзіць. Думаю, усе праз гэта праходзілі, нічога ганебнага.

А на пляцоўцы, калі ты малады, а побач з табой гуляюць алімпійскія чэмпіёны, ты, вядома, адразу адчуваеш сябе не асабліва ўпэўнена, але праз пару гульняў усё праходзіць.

***— Гісторыю са зменай грамадзянства сёння ўспамінаеце нармальна?***

— Так. Для Беларусі я быў ужо стары, мне было 32 або 33 гады, у зборную выклікаў я не атрымліваў, а для нямецкай зборнай падыходзіў. Паступіла прапанова ад трэнера Хайнера Бранда, я падумаў, чаму б не, чаму не паспрабаваць. Хацелася яшчэ пагуляць на такім высокім узроўні.

***— Калі сыходзілі са зборнай Беларусі, ёю кіраваў Спартак Мірановіч?***

— Так, але ніякіх нацягнутых адносін, як пісалі ў прэсе, у нас з ім ніколі не было. Я заўсёды казаў, што Спартак Пятровіч — гэта мой найлепшы трэнер за ўсе часы ў гандболе.

***— Напэўна, глядзелі на вас скоса і асуджалі тады многія?***

— Так, і ў газетах пісалі, але я стараўся наогул нічога не чытаць, прапускаць міма. Я лічу, што, калі чалавек да нечага імкнецца, глядзіць у будучыню, нічога ганебнага ў гэтым няма. Ды і для зборнай Беларусі я зрабіў шмат, не ведаю ці пабіты гэты рэкорд зараз, але тады згуляў за каманду больш за ўсё



матчаў і закінуў больш за ўсё мячоў, таму сумленне мяне не мучыць.

***— Як адрэагавалі на змену грамадзянства родныя?***

— Ды ўсё добра, падтрымалі, без праблем.

***— У Германіі ўдалося стаць сваім?***

— У нямецкай зборнай былі выдатныя адносіны, не проста камандныя, а сямейныя. Рабілі ўсё, каб не толькі гульцы, але і іх сем'і мелі зносіны паміж сабой. Нас выклікалі на зборы разам з жонкамі і дзецьмі. Мы трэніраваліся, а жонкі проста займаліся спортам, у абед разам маглі адпачываць, потым ладзілі дзень спаборніцтваў, калі мы былі разбітыя на пары і гулялі ў бадмінтон, футбол, валейбол. Гэта было вельмі цікава і нязвыкла.

***— Памятаеце свой першы матч за зборную Германіі?***

— Так шмат іх адыграў, што першы не памятаю дакладна. Увогуле ў мяне іх было 77. Я трапіў на чэмпіянат Еўропы, выйграў чэмпіянат свету, пабываў на Алімпійскіх гульнях. Паездзіў вельмі шмат. Найбольшых поспехаў дамогся менавіта з нямецкай зборнай. Думаю, выйграць чэмпіянат свету са зборнай Беларусі мне б не ўдалося.

***— Але вы так і не праспявалі гімн Германіі...***

— Нават не ведаю, як растлумачыць гэта...

***— Цяперашняя нямецкая зборная моцна адрозніваецца ад вашай?***

— Так, пакаленне змянілася, прыйшло шмат маладых гульцоў, гандбол стаў яшчэ хутчэйшы, больш сілавы, падбор гульцоў зусім іншы, фізічнае развіццё стала нашмат мацнейшае. Так увесь час адбываецца, гэта нармальны працэс.

***— Калі ўзяць зборную вашага часу і цяперашнюю, як думаеце, хто б выйграў?***

— Цяжка сказаць, шмат зорак было ў нас, шмат іх і цяпер. Дарэчы, з той зборнай мы часта збіраемся і зараз. Для нас арганізоўць турніры дзесьці каля пяці разоў на год, усе атрыманыя грошы ідуць на дабрачыннасць. Гэта вельмі прыемна — і пабачыцца, і дапамагчы камусьці.

* * *

***— У Беларусі часта бываеце на гандболе, можаце ацаніць яго цяперашні стан?***

— Назіраю рост. Адкрываецца ўсё больш дзіцячых школ, прыцягваецца шмат трэнераў, якія самі раней гулялі ў гандбол, якія сапраўды могуць навучыць і перадаць свой вопыт. Я лічу, гэта правільна: чым больш дзяцей будзе, тым больш чалавек потым прыйдзе ў зборную, тым больш зорак можна будзе знайсці.

***— Многія звяртаюць увагу на слабы ўнутраны чэмпіянат.***

— Так. Толькі вось пытанне, як зрабіць яго моцным? Мне здаецца, усё ўпіраецца ў фінансы, вядома, калі клуб можа дазволіць сабе добрых гульцоў, і ўзровень адразу падымецца і ўсе пачнуць расці. Чым больш моцных камандаў, тым больш вопыту, канкурэнцыі, а так атрымліваецца, што часам і глядзець не вельмі цікава.

***— Ці сачылі за БГК імя Мяшкова ў Лізе чэмпіёнаў?***

— Калі ёсць час, гляджу. Брэст — гэта прыстойная каманда, добрыя гульцы, зусім іншы ўзровень.

***— Што скажаце пра палітыку мінскага СКА, які вырошчвае моцных гульцоў, а потым яны сыходзяць у еўрапейскія клубы?***

— Для гульца, які сыходзіць у моцны клуб, гэта добра. Ён не варыцца ў гэтай кашы, а бачыць нешта новае, дадае ў майстэрстве, расце. У спартсмена век кароткі, таму яму трэба паспець не толькі нешта выйграць, але і зарабіць на будучыню, каб пракарміць сям'ю.

***— Вам было б цікава згуляць у сучасны гандбол?***

— Чаму не? Я ў сябе ў 3-й лізе яшчэ бегаю, але толькі ў абароне выходжу.

***— Пра што вы цяпер марыце, вашы трэнерскія амбіцыі?***

— Таксама развівацца і калі-небудзь не толькі трэцюю лігу трэніраваць, а хацелася б паспрабаваць далей, пайсці і ў другую, і ў першую. Цяжкавата мяняць род дзейнасці, калі аддаў аднаму ўсё жыццё, таму лічу, што трэба ўдасканальвацца ў гэтай галіне. Думаю, што разумею трошкі ў гандболе.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

ОТЧЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«ВЫИГРЫВАЙ ПО-MASTERски!»

**Место и дата составления отчета:**
04.06.2018 г.
г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328

1. Организатор: общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.
2. Наименование рекламной игры – «Выигрывай по-MASTERски!».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3199 от 31.01.2018 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.
4. Срок начала рекламной игры: 12 февраля 2018 г.
Срок окончания рекламной игры: 15 июня 2018 г.
5. Количество участников рекламной игры: 3 449 участников.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. Победители рекламной игры: 1 000 (тысяча) победителей.
Список победителей находится на сайте ОАО «Белгазпромбанка», www.belgazprombank.by, в разделе «Новости».
8. Для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 209-90-03.
9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было. Жалоб организатору и комиссии не поступало





# МАЯ МАЛАСТОЎКА



Вяртанне на малую радзіму заўсёды не праходзіць бясследна. Так здараецца і са мной кожны раз, калі я прыязджаю ў вёску. Маластоўка — так называлася раней мясціна, дзе я нарадзілася, скончыла школу. Маленькай я марыла з'ехаць адсюль у вялікі горад, вучыцца ва ўніверсітэце і больш ніколі не вяртацца. З цягам часу зразумела, што месца, дзе нарадзіўся, цябе не адпусціць ніколі, яно назаўжды застанецца ў тваім сэрцы.

**Таццяна ТКАЧОВА,**
*Магілёўская вобласць,*
*г. п. Краснаполле.*





*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

**ООО «Центр эксперт-услуг плюс» (организатор аукциона) проводит открытый аукцион по продаже: капитального строения (здание специализированное для общественного питания) с инвентарным номером 323/С-20414, общей площадью – 837,4 кв. м, расположенного по адресу: Гомельская область, г. п. Корма, ул. Илющенко, д. 4а, на земельном участке с кадастровым номером 322555100001001830 площадью 0,1166 га, предоставленном на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством**

Начальная цена продажи – 79 440,00 (семьдесят девять тысяч четыреста сорок) рублей с НДС;

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены продажи;

Задаток – 10 % от начальной сцены продажи;

Задаток перечисляется на расчетный счет BY33PJCB30124047901000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491331464, получатель платежа – ООО «Центр эксперт-услуг плюс», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 6 июня 2018 г.

Аукцион состоится 9 июля 2018 г. в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 5 июля 2018 г. до 15.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об предмете аукциона, размещены на сайте **auction.standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5 % обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на аукцион и определяется на основании представленных документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату за объект недвижимости в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором в случае если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

**Тел./факс: +375 (232) 21 21 61, + 375 (29) 303 39 33.**
**По вопросам осмотра имущества тел.+375 (44) 784 36 54.**
**E-mail: info@standard.by**

**ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом №1 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» № 152 (28516) от 10.08.2017, № 190 (28554) от 03.10.2017, № 223 (28587) от 18.11.17**

Дополнительно для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 4 (четыре) квартиры, в том числе:

– 1 (одна) 1-комнатная общей площадью 47,61 кв. м (квартира № 303);

– 2 (две) 2-комнатные общей площадью 57,72 кв. м (квартиры № 242, 270);

– 1 (одна) 3-комнатная общей площадью 76,83 кв. м (№ 261).

Стоимость 1 кв.м общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов для нормативной площади – **988,89 белорусских рублей**, для площади, превышающей нормативную – **1 301,82 белорусских рублей.**

**Условия оплаты –** ежемесячно на основании представленных застройщиком справок о стоимости выполненных работ, затратах застройщика и размере очередного взноса для оплаты стоимости строительства жилого помещения.

**Для заключения договоров необходимы:**

– справка о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий;

– паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься отделом ЖСПК, долевого строительства и аренды **с 11.06.2018** по графику приема граждан – понедельник с 8.30 до 17.30 (обед с 13.00 до 13.45), вторник с 8.30 до 13.00, среда с 13.45 до 17.30, четверг с 8.30 до 13.00 **по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44.**

УНП 192400611

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

Дата и время проведения: 19.06.2018 в11.00.
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 08.06.2018 до 09.00 18.06.2018.

| № лота | Наименование | Инв. № | Год выпуска, приобретения | Начальная цена, руб. | С учетом дисконта 40 % вторые повторные торги | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка для размотки бухт | 4935 | 1989 | 1 214,30 | 728,58 | 72,86 | 36,43 |
| 2 | Фальцепрокатный м-м ОКС-8906 | 4501 | 1980 | 2 105,00 | 1 263,00 | 126,30 | 63,15 |
| 3 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4336 | 1970 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 4 | Ножницы СТД-9А | 4843 | 1988 | 5 000,00 | 3 000,00 | 300,00 | 150,00 |
| 5 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4350 | 1979 | 2 105,00 | 1 263,00 | 126,30 | 63,15 |
| 6 | Пневмолистогибочный м-м И2116 | 4808 | 1983 | 7 160,00 | 4 296,00 | 429,60 | 214,80 |
| 7 | Пневмолистогиб | 4989 | 1990 | 7 160,00 | 4 296,00 | 429,60 | 214,80 |
| 8 | Механизм для вальцовки ВМС-85 | 4323 | 1966 | 8 005,00 | 4 803,00 | 480,30 | 240,15 |
| 9 | Механизм вальцепрокатный ОКС-9106 | 4939 | 1990 | 7 000,00 | 4 200,00 | 420,00 | 210,00 |
| 10 | Фальцеосадочный мех-м 5Н-475 | 4842 | - | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 11 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4332 | 1970 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 12 | Зигмашина ИБ-2713 | 4322 | 1965 | 3 580,00 | 2 148,00 | 214,80 | 107,40 |
| 13 | Машина точечной сварки МТ2201 | 5078 | - | 5 900,00 | 3 540,00 | 354,00 | 177,00 |
| 14 | Зигмашина ВМС-76В | 4321 | 1979 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 15 | Зигмашина ВМС | 4867 | 1980 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 16 | Зигмашина ВМС-76В | 4342 | 1979 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 17 | Зигмашина ИБ-2713 | 4338 | 1965 | 3 580,00 | 2 148,00 | 214,80 | 107,40 |
| 18 | Зигмашина ВМС-76В | 4339 | 1979 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 19 | Зигмашина ВМС-76В | 4809 | 1984 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 20 | Зигмашина ВМС-76В | 4925 | 1990 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 21 | Зигмашина ВМС-76 | 4320 | 1976 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 22 | Зигмашина ИБ-2713 | 4337 | 1965 | 3 580,00 | 2 148,00 | 214,80 | 107,40 |
| 23 | Зигмашина ВМС-76В | 4844 | 1988 | 2 950,00 | 1 770,00 | 177,00 | 88,50 |
| 24 | Механизм для вальцевания ОКС8998 | 8138 | 1982 | 7 000,00 | 4 200,00 | 420,00 | 210,00 |
| 26 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4352 | 1980 | 2 105,00 | 1 263,00 | 126,30 | 63,15 |
| 27 | Пресс механический КБ-262 | 4848 | 1987 | 21 910,00 | 13 146,00 | 1 314,60 | 657,30 |
| 28 | Ножницы гильотинные НБ-3118 | 4829 | 1987 | 7 000,00 | 4 200,00 | 420,00 | 210,00 |
| 29 | Лебедка стационарная | 8139 | 1988 | 1 815,27 | 1 089,17 | 108,92 | 54,46 |
| 30 | Машина для вальцовки РМ-750 | 4535 | 1968 | 5 200,00 | 3 120,00 | 312,00 | 156,00 |
| 31 | Ножницы гильотинные НА-3118 | 4522 | 1980 | 7 000,00 | 4 200,00 | 420,00 | 210,00 |
| 32 | Ножницы гильотинные НА-3222 | 4436 | 1980 | 11 830,00 | 7 098,00 | 709,80 | 354,90 |
| 35 | Стол для сборки металлических форм | 6242 | 2007 | 8 542,86 | 5 125,72 | 512,58 | 256,29 |
| 36 | Установка плазменной резки | 7016 | 2012 | 5 598,04 | 3 358,83 | 335,89 | 167,95 |
| 37 | Токарно-винторезный. ст.16К-20 | 4004 | 1980 | 4 800,00 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 38 | Горизонтально-фрезер. ст.6Р-82 | 4007 | 1975 | 3 900,00 | 2 340,00 | 234,00 | 117,00 |
| 39 | Вертикально-фрезерный ст.ВМ127М | 4952 | 1991 | 7 200,00 | 4 320,00 | 432,00 | 216,00 |
| 41 | Пресс листогибочный кривошипный | 7000 | 2006 | 12 170,89 | 7 302,54 | 730,26 | 365,13 |
